**ГАЗЕТА 10-й АРМІІ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ «БЕЙ ВРАГА», 1943,2 КАСТРЫЧНІКА.**

Крычаўскія вайсковыя злучэнні і часць. За вызваленне горада (29.09.1943) у ходзе Бранскай аперацыі 1943 г. загадам ВГК ад 30.09.1943 г. ганаровыя найменні «Крычаўскіх» нададзены злучэнням і 1 часці Бранскага фронту.

Злучэнні і часць, якім нададзены ганаровыя найменні «Крычаўскіх»: 212-я (палк. А.П. Мальцаў) і 385-я (палк. М.Ф. Супруноў) стралковыя дывізіі, 572-і нушачны артылерыйскі полк (палк. А.Я. Савін). Тэта быў першы загад ВГК у сувязі з вызваленнем гарадоў БССР ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

*М.І. Камінскі.*

**ГОНАР ВОІНАЎ**

**З асабістага архіва В.В. Міхайлава**

Нашей части присвоено наименование Кричевской. Это слово вечно будет сиять на ее боевом знамени, а мы - с гордостью будем вспоминать о том, как освободили город Кричев и вступили на землю родной Белоруссии.

Не один жаркий бой выдержали мы на подступах к городу Кричев. Враг не хотел отдать этот важный узел железных и шоссейных дорог, он цеплялся за каждую высотку, за каждый овраг. Ломая сопротивление врага, мы шли вперед. Однажды мое подразделение получило приказ - обходным маневром взять укрепленный немцами населенный пункт. Мы выполнили приказ. И когда немцы пошли в контратаку, ни один наш солдат не отступил ни на один шаг. Важная позиция осталась в наших руках. Пользуясь этим, вся наша часть решительно двинулась вперед.

Много геройства и доблести проявили рядовые, сержанты и офицеры нашей части в боях за город Кричев. Его имя теперь навсегда связано с нашей частью. Оно - наша воинская гордость.

Капитан Куренков.

## ВІНШАВАННЕ, НАКІРАВАНАЕ ГРАМАДСКАСЦЮ РАЁНА НА АДРАС ВОІНАЎ 385-Й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ З НАГОДЫ ГАДАВІНЫ ПРЫСВАЕННЯ ЁЙ ЗВАННЯ «КРЫЧАЎСКАЙ»

**Радавым, сяржантам і афіцэрам**

Трудящиеся города Кричева и Кричевского района шлют пламенный братский привет своим освободителям - воинам нашей славной 385 Кричевской стрелковой дивизии в день годового праздника.

Каждый трудящийся нашего района носит в своем сердце горячую благодарность, признательность, с волнением вспоминает 30 сентября - день, когда вы с боями освободили наш город. Мы гордимся вашими боевыми делами!

Великий Сталин присвоил вам имя нашего города. Мы уверены, что с мужеством и отвагой вы будете освобождать города и села родной Белоруссии, с честью пронесете знамя дивизии во всех боях с немецкими захватчиками.

Мы приложим все силы, чтобы помочь вам в окончательном разгроме ненавистного врага.

Да здравствует 385 Кричевская стрелковая дивизия, ее славные рядовые, сержанты и офицеры!

Да здравствует свобода и независимость нашей Родины!

*З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.*

## АДКАЗ ВОІНАЎ 385-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ГРАМАДСКАСЦІ КРЫЧАЎСКАГА РАЁНА

Сакратару Крычаўскага райкома КП(б)Б, старшыні райсавета дэпутатаў працоўных

Дарагія таварышы! Байцы, сяржанты і афіцэры дывізіі, якая носіць назву вашага горада, шлюць працоўным Крычава і Крычаўскага раёна гарачае баявое прывітанне!

Каля года назад мы, громячы ненавіснага ворага, вызвалілі ваш горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы бачылі попел пажарышчаў і варварскія разбурэнні, прычыненыя Крычаву гітлераўскімі мярзотнікамі. За гэтыя раны, якія нанесены вашаму савецкаму гораду, мы жорстка помсцілі і помсцім разбойнікам.

За час, які прайшоў пасля вызвалення Крычава, наша дывізія прайшла вялікі і слаўны шлях, памнажаючы славу савецкай зброі. З часу апошніх наступальных баёў на Крычаўшчыне дывізія з баямі прайшла каля 800 кіламетраў, вызваліўшы ад ворага тысячы населеных пунктаў, вызваліўшы з-пад фашысцкага прыгнёту дзесяткі тысяч савецкіх людзей.

Дывізія нанесла ворагу вялікі ўрон у жывой сіле і тэхніцы, захапіла багатыя трафеі і 4500 палонных, у тым ліку аднаго генерала, камандуючага армейскім корпусам, разам з яго штабам.

За баявыя поспехі мы ўдастоены вялікага гонару - Вярхоўны Галоўнакамандуючы аб'явіў нам падзяку, а ўрад узнагародзіў дывізію ордэнам Чырвонага Сцяга.

Зараз дывізія знаходзіцца ўжо за межамі нашай Радзімы і, працягваючы граміць нямецка-фашысцкага звера, набліжаецца да граніц яго чорнай бярлогі. Будзьце ўпэўнены, таварышы, што воіны Чырвонай арміі з гонарам выканаюць не толькі першую, але і другую задачу, даб'юць параненага нямецкага звера ў яго ўласнай бярлозе.

Наступаючы, громячы ворага, мы паўсядзённа адчуваем найвялікшыя клопаты аб нас. Ваша самаад даная праца ў тыле, вашы працоўныя подзвігі натхняюць нас на новыя перамогі. Мы сочым за работай працоўных вызваленых раёнаў, і асабліва Крычаўскага раёна, што аднаўляюць разбураную гітлераўскімі варварамі гаспадарку. Вашы поспехі напаўняюць нашы сэрцы гордасцю. І вось мы, жадаючы дапамагчы вам у аднаўленні гаспадаркі і ў знак непарушнай дружбы фронту і тылу вырашылі ўручыць працоўным Крычаўскага раёна падарунак - двух племянных жарабцоў...

Жадаем Вам новых працоўных поспехаў.

Няхаў жывуць працаўнікі тылу!

Камандзір Чырванасцяжнай Крычаўскай стралковай дывізіі, палкоўнік Супруноў.

Начальнік палітаддзела Чырванасцяжнай Крычаўскай стралковай дывізіі, палкоўнік Міхайлаў.

11 жніўня 1944.

*«Шлях сацыялізму», 20 жніўня 1944 г.*

## ВІНШАВАННЕ, НАКІРАВАНАЕ ГРАМАДСКАСЦЮ РАЁНА НА АДРАС ВОІНАЎ 385-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ З НАГОДЫ УЗНАГАРОДЖАННЯ ДЫВІЗІІ ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

Камандзіру Чырванасцяжнай Крычаўскай стралковай дывізіі палкоўніку Супрунову.
Начальніку палітаддзела Чырванасцяжнай Крычаўскай стралковай дывізіі палкоўніку Міхайлаву.

Дарагія нашы вызваліцелі!

Ад імя калгаснікаў, рабочых і інтэлігенцыі горада і раёна мы шчаслівы віншаваць вас, заслужыўшых падзяку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна, з гераічнымі баявымі поспехамі і з узнагароджаннем дывізіі ордэнам Чырвонага Сцяга.

Разам з віншаваннем прыміце нашу падзяку, нашы родныя, дарагія героі-воіны, за вашы баявыя дзеянні, за вашу слаўную франтавую гераічную працу і вашы клопаты аб аднаўленні і развіцці конегадоўлі ў раёне.

Ваш падарунак - двух племянных жарабцоў - перадалі лепшым калгасам раёна «Май» і «Маяк».

Героі нашы родныя! Працоўныя раёна не забываюць вас і ўсю нашу слаўную Чырвоную армію. Ды ці можна забыць сваіх збавіцеляў ад гітлераўскай чумы!

І тэта гераічнае лета калгаснае сялянства, стаўшы ўноў гаспадаром сваёй зямлі, сваіх калгасаў, у тэрмін выканала план веснавой сяўбы, багаты ўраджай вырас на вызваленай калгаснай зямлі. Калгасы раёна ў тэрмін убралі азімыя, прыступілі да абмалоту, ужо здалі дзяржаве 1204 пуды хлеба.

Па-ваеннаму працуе калгаснае сялянства. Рабочыя аднаўляюць прамысловасць. Ідзе падрыхтоўка да новага навучальнага года, будуем і рамантуем школы.

Працоўныя раёна падпісаліся на трэцюю Дзяржаўную Ваенную пазыку на суму 3845000 рублёў і ўнеслі наяўнымі 1592000 рублёў.

У гэтым годзе ўсе слаі насельніцтва раёна працуюць па аднаўленню народнай гаспадаркі і культуры, як яшчэ ніколі не працавалі.

Запэўніваем вас, а ў вашай асобе ўсіх воінаў Чырвонай арміі, што працоўныя вызваленага горада і раёна, імя якога носіць ваша дывізія, у будучым не пашкадуюць сіл і сродкаў для дапамогі фронту, для дапамогі сваім родным героям, сваім вызваліцелям і да гадавіны свайго вызвалення закончыць уборку калгаснага ўраджаю, здачу дзяржаве хлебанарыхтовак, выканаюць план сяўбы азімых.

Жадаем вам і ў будучым гераічных подзвігаў!

Няхай жыве наша слаўная ўсеперамагаючая Чырвоная армія, армія-вызваліцельніца!

Старшыня выканкама Крычаўскага райсавета дэпутатаў працоўных А. Цыганкоў.
Сакратар Крычаўскага РК КП(б)Б Беларусі К. Рэуцкі.

*З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.*

## РУ ЧНІК СТАЎ РЭЛІКВІЯЙ

Савецкія войскі паспяхова фарсіравалі раку Сож і 29 верасня 1943 г. з баямі ўвайшлі ў Крычаў.

Наперад прарваўся 1-ы батальён 669-га стралковага палка пад камандаваннем капітана К. Жукава, які разам з таварышамі вызваляў дзесяткі гарадоў і вёсак. Усюды іх радасна сустракалі мірныя жыхары.

Ледзь падступілі байцы да Крычава, як убачылі мясцовых жыхароў, якія накіроўваліся да іх. Наперадзе ўрачыста крочыла пажылая жанчына і несла на прыгожа вышытым ручніку хлеб-соль. Яна падыйшла да капітана. Камандзір батальёна Б.І. Гальперын падаў каманду: «Батальён, смірна!»

—Вазьміце, дарагія нашы вызваліцелі, хлеб-соль, - не хаваючы слёз, сказала жанчына.

Жукаўузяў дарунак і нізка пакланіўся: «Дзякуй, маці!».

—Мы так чакалі вас, так чакалі і вось дачакаліся. Вялікі дзякуй вам, родненькія нашы!

Жукаў паспытаў хлеба і солі, а потым перадаў іх афіцэрам і салдатам, якія стаялі побач.

А прыгожы ручнік аддаў жонцы, медсястры Наташы Навасадавай. На грудзях маладой жанчыны ззялі ордэны Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалі...

3 таго часу прайшло 30 гадоў. Жыхары Крычава на кургане Славы віталі ветэранаў 10-й і 50-й армій, воіны якіх вызвалялі іх родную зямлю. Хвалюючай была сустрэча былых воінаў.

Пачаўся мітынг. Успаміналі ветэраны бой за Крычаў, нялёгкія франтавыя дарогі. Уважліва слухалі прысутныя Наталлю Дзмітрыеўну Навасадаву, удзельніцу вызвалення Крычава. Муж яе, Канстанцін Жукаў, загінуў у Прыбалтыцы. Наталля Дзмітрыеўна дастала з сумачкі прыгожа вышыты ручнік і падаравала яго супрацоўнікам музея. Той самы ручнік, які жанчыны-крычаўлянкі падаравалі яе мужу разам з хлебам-соллю ў дзень вызвалення. Ручнік вярнуўся на родную зямлю, цяпер ужо ў якасці дарагой рэліквіі...

*М. Мельнікаў.*

## АБ ЧЫМ ПІСАЛА РАЁННАЯ ГАЗЕТА «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ»

### На станцыі Крычаў

Пры адступленні гітлераўцы дашчэнгу зруйнавалі чыгуначны вузел. На станцыі не засталося ні аднаго цэлага будынка. Былі ўзарваны рэйкі, стрэлачныя пераводы, вадакачка, мост цераз р. Сож. Рабочыя-чыгуначнікі неадкладна пасля выгнання немцаў узяліся за аднаўленне вузла.

Тэмпамі ваеннага часу працуюць рабочыя. Так, брыгада т. Карпекіна за адзін дзень 12 кастрычніка ўклала 700 нагонных метраў чыгуначнай лініі. Брыгада т. Бубнова за тэты ж дзень уклада 600 нагонных метраў і ўстанавіла адзін стрэлачны перавод. 26 рабочых брыгады т. Рубчынскага перашылі за дзень 1000 пагонных метраў лініі і ўстанавілі 3 стрэлачныя пераводы. Не адстае і брыгадат. Рубчынскага Г, якая перашыла 200 пагонных метраў лініі, ачысціла лінію на працяжэнні 800 пагонных метраў і падрыхтавала рэек з абломкаў на 400 пагонных метраў. Сіламі рабочых на станцыі пабудавана кузня і арганізавана работа па ўстанаўленню водазабеспячэння станцыі.

*Смалякоў.*

### На калгасных сходах

Днямі адбыліся агульныя сходы калгаснікаў Міхеевіцкага сельсавета.

У рэзалюцыях сходаў калгаснікі выражаюць сваю ўдзячнасць слаўнай Чырвонай арміі, якая вызваліла з-пад гнёту нямецка-фашысцкіх бандытаў. Абязуючыся ўсімі сродкамі дапамагаць Чырвонай арміі гнаць заклятага ворага далей на Захад, працоўныя сельсавета заяўляюць: «Да 26-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі мы абяцаем умацаваць нашы калгасы, закончыць пасеў азімага кліна, поўнасцю завяршыць уборку ўраджаю, арганізаваць сытную і цёплую зімоўку жывёле калгасаў...»

*3 пратаколаў огульных сходаў калгаспікаў.*

### Кіно ў Крычаве

У г. Крычаве пачалася дэманстрацыя кінафільмаў. Упершыню пасля двухгадовага паднявольнага жыцця мы з захапленнем прагледзелі новыя савецкія кінафільмы:«Арлоўская Бігва», «Паветраны рамізнік» і «Народныя мсціўцы». Асабліва спадабалася нам кінакарціна «Народныя мсціўцы», якая адлюстроўвае гераічную барацьбу партызан супраць нямецкіх акупантаў. Вялікае ўражанне засталося ў нас пасля прагляду «Арлоўскай бітвы», якая наказвае магутнае наступление Чырвонай арміі.

*В. Мазалькова, 3. Цёханава.*

**Першыя пісьмы**

Адразу ж пасля вызвалення Крычаўскага раёна ад гітлераўскіх бандытаў распачала работу раённая кантора сувязі. За кароткі час абсталяваны невялікі радыёвузел, а таксама тэлсфонная станцыя. Пры сельсаветах адчынена 9 паштовых аддзяленняў. Пачаўся рэгулярны абмен карэспандэнцыямі. З 4-га па 13-е кастрычніка адпраўлена 1996 пісем на фронт і ў розныя гарады Савецкага Саюза. 13 кастрычніка прыбыла першая пошта і ў Крычаў. Былі дастаўлены цэнтральныя газеты і пісьмы.

Адным з першых атрымаў пісьмо з Масквы ад сына-лётчыка жыхар г. Крычава Сямён Кандратавіч Зуеў. Сын віншуе бацькоў з вызваленнем роднага горада ад нямецкіх акупантаў.

*В.В. Палянскі.*

*«Шлях сацыялізму», 1943, 16 кастрычніка.*

# Іх пазнаёміла вайна

Вызвалены ад фашыстаў Крычаў ляжаў у руінах. Усюды чарнелі выбітыя снарадамі ямы, ляжалі кавалкі раструшчанай цэглы, панура стаялі абгарэлыя хаты. А раённыя ўстановы ўжо працавалі. У цеснаваты пакойчык бюро ЗАГС раніцай зайшоў малады афіцэр з ордэнамі і медалямі на старанна адпрасаванай гімнасцёрцы і дзяўчына.

— Хочам зарэгістраваць шлюб, — сказаў афіцэр, дастаючы дакументы.

Гэта быў Уладзімір Акімавіч Сілкін, ураджэнец Крычава. Ён закончыў Пензенскае артылерыйскае вучылішча перад самай вайной. Першы бой маладому афіцэру давялося прыняць пад Белай Царквой на Кіеўшчыне. Байцы адбівалі бясконцыя атакі фашысцкіх танкаў, якія, пры падтрымцы пяхоты, ірваліся наперад. Мужна змагаліся нашы воіны, трапнымі стрэламі падпальваючы танкі. У тым баі з узво- да жывым застаўся толькі Уладзімір Сілкін. Артылерысты цаной свайго жыцця выканалі загад камандавання, не адступілі і да апошняга стрымлівалі рух варожай калоны.

Потым Уладзімір Сілкін удзельнічаў у абароне Сталінграда, ваяваў на Курскай дузе, вызваляў Беларусь ад акупантаў. Нямала пройдзена было нялёгкіх франтавых дарог і над пякучым сонцам і ў завейныя, марозныя часіны.

У час бітвы на Курскай дузе лёс звёў яго з маладой дзяўчынай, медсястрой Вольгай. Спадабалася Сілкіну яе мужнасць, увішнасць, ласкавае абыходжанне з раненымі. Нарадзілася яна ў г. Дзяржынску Горкаўскай вобласці, дабраахвотна пайшла на фронт. Каханне прыйшло да абодвух, хоць ва- кол былі смерць, гора і боль.

Баі ўжо ішлі пад Рагачовам. Даведаўшыся, што Крычаў вызвалены ад чужынцаў, Уладзімір папрасіў у камандавання кароткатэрміновы вод- пуск, каб прыехаць на радзіму і зарэгістраваць шлюб. Просьбу яго задаволілі. Уладзімір і Вольга атрыма- лі шлюбнае пасведчанне №1. Гэта была першая сямейная пара, зарэгі- страваная Крычаўскім бюро ЗАГС пасля вызвалення горада ад фашыстаў.

Стаўшы мужам і жонкай, Уладзімір і Вольга зноў вярнуліся на фронт. Вайна працягвалася, вораг аказваў жорсткае супраціўленне. Сябры цёпла па-

віншавалі маладых пад посвіст куль і выбухі снарадаў.

На Крычаўшчыну Уладзімір і Вольта вярнуліся ў 1945 годзе. Грудзі артылерыйскага маёра ўпрыгожвалі два ордэны Айчыннай вайны, два - Чырво- най Зоркі, ордэн Аляксандра Неўска- га, медалі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна» і шмат іншых. Паблісківалі ўзнагароды і на грудзях яго жонкі, адважнай і руплівай медыцынскай сястры. У пасляваенны час Уладзімір Акімавіч і Вольта Пятроўна працавалі ў розных галінах народнай гаспадаркі. За самаадданую працу Вольта Сілкіна была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

*З.М. Качкова.*

## У нашай памяці навечна

Я не памятую свайго прадзеда. Але пра яго мне расказаў бацька, машыніст лакаматыўнага дэпо.

Мой прадзед, Віктар Сяргеевіч Паўлаў, пайшоў на вайну ў 1941 годзе. Быў выпускны баль. А раніцай наступнага дня, пасля выпускнога, пачалася Вялікая Айчынная вайна. Ён вучыўся з аднагодкамі ў той жа школе, што і я цяпер. І школьныя класы і калідоры памятуюць пра вучняў тых год. Ён быў музыкантам, пасля гарачых баёў браў трубу і на прывалах граў. Звала яго труба і ў бой з ворагам. Прадзед дайшоў да Берліна. Ён узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна». Быў кантужаны і лячыўся ў шпіталі. Вярнуўся з вайны інвалідам вайны III трупы. Пасля Перамогі над фашыстамі працаваў у лакаматыўным дэпо загадчыкам хімічнай лабараторыі. А пасля работы ішоў у клуб чыгуначнікаў, дзе кіраваў духавым аркестрам. Да яго ішлі вучыцца і вучні школ, і рабочыя. Духавы аркестр быў самым маладым у горадзе. Дзеці гралі сваім бацькам на святах. Аркестр праводзіў у апошні шлях ветэранаў чыгункі. Чароўныя гукі духавога аркестра звалі вечарам на танцпляцоўку. Духавы аркестр нёс людзям весялосць і радасць, імкненне і жаданне жыць.

Няма ў жывых прадзеда. Але напамінаюць аб ім ноты, яго дыпломы, фотаздымкі тых часоў, баявыя ўзнагароды. Ён скончыў Ленінградскі хіміка-тэхналагічны інстытут і інстытут культуры. Адыходзяць з кожным годам ветэраны. Яны адлятаюць ад нас, нібы тыя журавы ў вырай. Але памяць аб іх застаецца назаўсёды.

Я кожны год 9 мая іду на Курган Славы. Іду на сустрэчу са сваім прадзедам. Бачу яго сяброў, ветэранаў, якія таксама змагаліся з фашыстамі за наша жыццё. І калі чую гукі духавога аркестра, то ўпэўнены,што дзесьці побач і мой прадзед грае на трубе. Я бачу, як граюць яго вучні. Музыка духавога аркестра, як і памяць аб чалавеку, — вечная. Няхай заўсёды грае духавы аркестр майго прадзеда... Ён нясе мелодыі тых ваенных часоў, Перамогі 1945 года!

*Саша Васіленка,*
*вучань 5 «Б» класа школы №4 г. Крычава.*

# Героі Савецкага Саюза — ураджэнцы Крычаўшчыны

**ГУСАКОЎСКІ Іосіф Іракліевіч,** нарадзіўся 25.12.1904 г. у вёсцы Вародзькава. Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945), генерал арміі (1968). У Чырвонай арміі з 1928 г. Скончыў кавалерыйскую школу (1931), Ваенную акадэмію Генштаба (1948). 3 ліпеня 1941 г. на Заходнім, Варонежскім, 1-м Украінскім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах: начальнік штаба танкавага палка, танкавай брыгады, з 1943 г. камандзір танкавай брыгады. Удзельнік Маскоўскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Польшчы, баёў за Берлін. Вызначыўся пры знішчэнні бродскай групоўкі праціўніка ў час Львоўска-Сандамірскай аперацыі 1944 г.

За ўмелае кіраўніцтва брыгадай і мужнасць, праяўленую ў ходзе гэтай аперацыі, палкоўнік Гусакоўскі быў удастоены звания Героя.

У ходзе Вісла-Одэрскай аперацыі брыгада атрымала загад выступіць перадавым атрадам. Атрад пайшоў да ракі Пііца, у раёне Новэ-Мяста. Аднак з ходу яе фарсіраваць не змог, бо пераправы былі ўзарваны, а лёд аказаўся тонкім. Гусакоўскі прыняў рашэнне ўзарваць лёд і перайсці раку па дну ноччу. Плацдарм быў захоплены, пераправа галоўных сіл корпуса забяспечана.

Прарваўшыся ў тыл Мезярыцкага ўмацаванага раёна, брыгада на праця- гу двух сутак, у адрыве ад галоўных сіл корпуса, утрымлівала захоплены раён. Танкісты 44-й гвардзейскай брыгады вялі напружаныя абарончыя баі да падыходу галоўных сіл корпуса, і 6 красавіка 1945 г. камандзір брыгады гвардыі палкоўнік 1.1. Гусакоўскі стаў двойчы Героем Савецкага Саюза.

У сям’і Гусакоўскіх, акрамя Іосіфа, было яшчэ 5 сыноў і 2 дачкі. Усе браты Гусакоўскія былі абаронцамі Радзімы. Старэйшы, Адам Іракліевіч Гусакоўскі, удзельнічаў у грамадзянскай вайне, вучыўся ў ваеннай акадэміі імя Фрунзе. Памёр у Маскве ва ўзросце 34 гадоў. Палкоўнік запаса, ваенны ўрач Фёдар Іракліевіч Гусакоўскі, удзельнік



Парад партызан у Крычаве, кастрычнік 1943 г.

грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ваенным мараком-афіцэрам стаў Яўген Іраклievіч Гусакоўскі. Усю Вялікую Айчынную правёў на перадавой лініі начальнік аператыўнага аддзела авіядэсантнай дывізіі Аляксандр Іраклievіч Гусакоўскі. Загінуў 17.03.1945 г. у Венгрыі. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне Георгій Ірак- ліевіч Гусакоўскі. Быў цяжка паранены.

Пасля вайны І.І. Гусакоўскі на камандных пасадах. Камандаваў танкавай дывізіяй, аб'яднаннем, войскамі Прыбалтыйскай ваеннай акругі, быў начальнікам Галоўнага ўпраўлення кадраў Міністэрства абароны СССР. З 1970 г. у Трупе генеральных інспекта- раў Міністэрства абароны СССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1962—1970 гг. Узнагароджаны 4 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, 4 ордэнамі Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам «За службу Радзіме ва Ўзброеных сілах СССР» ІІІ-й ступені, а так- сама замежнымі ордэнамі. Памёр 20.02.1995 г. У Крычаве яго імем названа вуліца, у Магілёве пастаўлены бюст. Аўтар кнігі «Помніце - вы сяржант» (М., 1961).



І.І. Гусакоўскі.



А.І. Смалякоў.

**СМАЛЯКОЎ Абрам Яфімавіч,** нарадзіўся 29.05.1908 г. у вёсцы Ермакоўка. Герой Савецкага Саюза (1943). Скончыў курсы Вышэйшай партшколы ў Кіеве. Знаходзіўся на партыйнай рабоце ў Ташкенце. У Чырвонай арміі з 1930 г. На фронце з 1941 г. Намеснік камандзіра на палітчастцы знішчальнага процітанкавага артылерыйскага палка маёр Смалякоў вызначыўся ў Курскай бітве на Белгарадскім напрамку. Полк, у саставе якога знаходіўся А.Я. Смалякоў, 6—7.07.1943 г. знішчыў 89 танкаў праціўніка.
30.09.1943 г. пераправіўся цераз Дняпро каля Канева і заняў абарону.
3.10.1943 г. у контрнаступленні вораг пацясніў нашы стралковыя часці. А.Я. Смалякоў удзельнічаў у адбіцці атак праціўніка, асабістым прыкладам натхняў артылерыстаў на выкананне баявой заданы. У час бою вёў агонь з гарматы, разлік якой выйшаў са строю. Некалькі танкаў было падбіта, знішчаны дзесяткі гітлераўцаў. У гэты дзень ён загінуў.

Званне Героя прысвоена пасмяротна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, медалём «За адвагу». Іiахаваны ў сяле Ляплява Канеў- скага раёна Чаркаскай вобл. Яго імем названа вуліца ў Крычаве.

У Крычаўскім краязнаўчым музеі захоўваецца надпіс на фотаздымку, які А.Я. Смалякоў паслаў сыну 17 верасня 1941 года: «На памяць роднаму сыну Вове. Памятай, сынок, калі твай- му бацьку давядзецца загінуць у Айчыннай вайне, памерці за радзіму ў барацьбе супраць заклятых ворагаў - гітлераўскіх сабак, ты, сынок, будзь патрыётам сваёй Айчыны. Помсці, колькі будзеш жыць, за кроў тых, хто

загіне ў барацьбе з крывавым фашыз- мам. Гартуйся як сталь. Будзь непрымірымым да ворагаў. Твой бацька А. Смалякоў».

**СТАЛЯРОЎ Мікалай Іванавіч,** нарадзіўся 20.05.1919 г. у г. Крычаў. Герой Савецкага Саюза (1943). З дзяцінства жыў у Ленінградзе. Скончыў 7 класаў школы № 35, школу ФЗН, працаваў на суднабудаўнічым заводзе. У Чырвонай арміі з 1938 г. Скончыў Чугуеў- скае ваеннае авіяцыйнае вучылішча (1940). З пачатку вайны ў Закаўказскай ваеннай акрузе, потым на Сталінградскім, Калінінскім, Паўднёва-Заходнім, 2-м Украінскім франтах. Намеснік камандзіра эскадрыллі 629-га знішчальнага авіяцыйнага палка лейтэнант М.І. Сталяроў вызначыўся ў баях пад Сталінградам. За час вайны зрабіў 310 баявых вылетаў, правёў 67 паветраных баёў.

Аднапалчанін М. Сталярова палкоўнік М. Астапчук успамінаў: «Мікалай Сталяроў не толькі лятаў вядучым, але і арганізоўваў баі эскадрыллі, выконваючы самыя адказныя даручэнні па разведцы тылу праціўніка. Нягледзячы на супрацьдзеянне гітлераўскіх зенітак, лейтэнант Сталяроў на сваёй чырвоназорнай машыне прарываўся ў раёны станіц Бокаўская, Марозаўская, Чарнышэўская, і здабытыя дадзеныя аб нямецка-фашысцкіх войсках своечасова дастаўляў камандаванню, што мела вялікае стратэгіч- нае значэнне».

За час вайны зрабіў 310 баявых вылетаў, правёў 67 паветраных баёў, збіў 6 самалётаў праціўніка, 4 у трупе. Да 1960 г. у Савецкай арміі, палкоў- нік, потым да 1970 г. на адміністратыўнай і гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны І ступені, 2 ордэнамі Чырвонай зоркі, медалямі. Памёр 14.08.1985 г.

## Поўны кавалер ордэна Славы

**КАРНЕЕНКА Уладзімір Якаўлевіч,** нарадзіўся 15.07.1924 г. у вёсцы Губіншчына. Поўны кавалер ордэна Славы. На фронце з 1943 г. Камандзір кулямётнага разліку ст. сяржант У.Я. Карнеенка вызначыўся пры вызваленні Беларусі і Полынчы: 28.02.1944 г. у в. Янава Быхаўскага раёна знішчыў кулямёт і каля 20 гітлераўцаў, паране- ны працягваў бой; у ліпені 1944 г. у баі на тэрыторыі Смалявіцкага раёна прабраўся з разлікам у тыл праціўніка, агнём пасеяў паніку, гэтым памог савецкім падраздзяленням прарваць нямецкія пазідыі. У студзені 1945 г. на тэрыторыі Польшчы ўдзельнічаў у адбіцці 5 варожых атак.



М.І. Сталяроў.



У.Я. Карнеенка.

# Мужнасць кулямётчыка

Наступіў 1943 год.

Познім зімовым вечарам з адной хаты вёскі Губеншчына выйшаў на вуліцу юнак, апрануты ў ватоўку, з туга напакаванай палатнянай торбачкай за плячыма. Ён пастаяў нейкі час на бязлюднай дарозе, прыслухоўваючыся, потым рашуча пакрочыў у бок недалёкага лесу.

Мароз памякчэў, цёпла дыхнуў паўднёвы вецер, і снег, абліты святлом поўні, страціў сваю настылую рыплівасць. Юнак спяшаўся хутчэй праскочыць поле і з палёгкай уздыхнуў, калі апынуўся пад хваёвымі шатамі змрочнага лесу. Гэта быў Уладзімір Карнеенка, трымаў ён шлях у лясы пад Прапойскам, дзе, як яму расказалі, змагаўся з гітлераўцамі партызанскі атрад «13» пад камандаваннем Сяргея Уладзіміравіча Грышына. Менавіта туды хацелася Карнеенку трапіць і менавіта там ваяваць.

Ісці па снезе было цяжка. Дарогі ў лесе не траплялiся, усюды ляжаў некрануты сыпкі снег, у які глыбока правальваліся ногі. На палявыя сцяжыны выходзіць было небяспечна, выпадкова можна напароцца на немцаў ці паліцаяў.

Світанак заспеў Уладзіміра за Чэрыкавам. Днём юнак рашыў не рухацца, забіўся ў лясны гушчар, наламаў на подсціл лапніку, расклаў з усохлага галля агеньчык, падсілкаваўся і лёг адпачыць. Вечарам зноў рушыў у дарогу.

У Прапойскія лясы Карнеенка трапіў на трэція суткі. Яны яго сустрэлі нязвыклай цішынёй і бязлюддзем. Куды падацца, дзе шукаць партызан?

Між тым торбачка з харчам прыкметна апусцела, заставалася некалькі цыбулін і падмерзлы кавалачак хлеба. Хацелася ад стомы піць, і Уладзімір прагна глытаў снег. Ён пайшоў напрасткі, борам. Сцямнела, на небе высыпал! буйныя зоркі. Уладзімір спыніўся, з усіх бакоў яго акружала чарна- та. Зноў наламаў лапніку, уладкаваў- ся адпачываць. Недзе згаладала вылі ваўкі. Юнак намацаў у кішэні пісталет. Праўда, патронаў было мала, усяго шэсць штук.

Раніцай рашыў падацца ў другі бок. Невыносным агнём пякло здарожаныя ногі, па целе разлівалася слабасць. Здрадліва хіліла да сну, але Уладзімір ведаў: засні, заплюшчы вочы і акале- еш на марозе. Таму імкнуўся рухацца, не здавацца зморы.

Толькі на чацьвёртыя суткі Карнеенку, згаладалага, знясіленага, абмарожанага, знайшлі разведчыкі з атрада Сяргея Уладзіміравіча Грышына і прывялі ў атрад. Так ён стаў партызанам. У той час Залатая зорка Героя Савецкага Саюза ўпрыгожвала грудзі камандзіра атрада «13». Гэта быў адважны і вопытны партызанскі важак.

Мара Карнеенкі збылася, ён пачаў ваяваць з фашыстамі ў складзе атрада Грышына. Партызаны рабілі засады на шасэйных дарогах, узрывалі чыгуначныя маеты, нападалі на ўмацаваныя гарнізоны, пускалі пад адхон варожыя эталоны з жывой сілай і тэхнікай. І ва ўсіх гэтых баявых аперацыях самы актыўны ўдзел прымаў Уладзімір Якаўлевіч Карнеенка.

Правакатары высачылі месца знаходжання лагера народных мсціўцаў і данеслі аб гэтым нямецкаму камандаванню. У аперацыі па ліквідацыі партызан былі задзейнічаны дзве фашысцкія дывізіі, узброеныя танкамі, гарма-

тамі, мінамётамі і новымі самалётамі. Між тым у партызан мелася толькі стралковая зброя.

Закіпелі цяжкія баі недалёка ад вёсак Рабінаўка, Рабвічы, Лясная на Прапойшчыне. Была восень, днём безупынна лілі дажджы, а раніцамі размоклую зямлю выбельваў іней. Сілы былі няроўныя. Ворагу ўдалося акружыць атрад Грышына. Пачалася Боўская блакада. Васемнаццаць дзён і начэй не змаўкала ў лясах страляніна, парахавы дым, нібы туман, заслаў наваколле.

Гітлераўцы ўжо бачылі блізкую перамогу. Для іх не было сакрэтам тое, што ў партызан не засталося харчу і канчаюцца боепрыпасы, яны чакалі, што вось-вось народныя мсціўцы з'явяцца перад імі з узнятымі рукамі. Становішча партызан было сагіраўды цяжкім. Камандаванне рашыла ісці на прарыў блакады. Было тэта рызыкоўна, аднак іншага выйсця не існавала.

Глухой цёмнай ноччу партызаны бясшумна падпаўзлі да варожых пазіцый і напалі на гітлераўцаў. Заспелыя знянацку, немцы адкрылі страляніну і пачалі мітусіцца. Гэтую неразбярыху ў стане ворага і выкарысталі партызаны, паспяхова прарваўшы шчыльнае кальцо акружэння. Гітлераўцы не змаглі адразу пусціцца за партызанамі ў пагоню. Адарваўшыся ад ворага, народныя мсціўцы зрабілі нядоўгі пры- пынак, перавязалі раненых і рушылі далей.

Хутка атрад Грышына сустрэўся з часцямі Чырвонай арміі, што гналі чужынцаў з захопленай тэрыторыі. Гэта была незабыўная сустрэча.

Уладзімір Карнеенка з партызанскага атрада трапіў на фронт, стаў кулямётчыкам. Пачаліся нялёгкія франтавыя будні. У роце ваявалі людзі роз ных нацыянальнасцей: малдаване, украінцы, армяне, азербайджанцы. Былі тут воіны як маладога, так і сталага ўзросту, спрактыкаваныя і вопытныя абаронцы Радзімы.

... Люты 1944 года выдаўся снежным, марозным і завейным. Уначы чырвонаармейцы фарсіравалі раку Днепр і захапілі вышыню кіламетраў за 11 ад Быхава. Фашысты скаціліся ўніз, ачомаліся ад імклівага ўдару наших войск і зразумелі, што страцілі важную стратэгічную пазіцыю. Рашылі адваяваць любой цаной вышыню і замацавацца на ёй.

Кулямётная рота, у якой ваяваў Уладзімір Карнеенка, заняла абарону. Завязаўся гарачы бой. Буйныя сілы немцаў штурмавалі вышыню, іх падтрымлівала артылерыя. Снарады разрывал! мёрзлую зямлю, асколкі з шумам прашывалі паветра. Вырыць акопчык Карнеенка не паспеў, ляжаў у сыпкім снезе і вёў прыцэльны агонь па ворагу. Байцы адбілі адну контратаку, але цішыня пастаяла над наваколлем нядоўга: фашысты зноў пайшлі на штурм вышыні. Ствол кулямёта рабіўся малінавым, і Уладзімір ахалоджваў яго снегам.

ГІа тым, як радзеў кулямётны агонь, Карнеенка зразумеў, што многія яго сябры цяжка паранены або забіты. Яго «максім» працаваў бесперапынна. Галоўнае - не даць гітлераўцам узняцца для атакі, не даваць ім магчымасці паўзці, набліжацца да занятых пазіцый. Раптам штосьці балюча апякло нагу. Перавязаць рану не было часу: фашысты ўпарта лезлі ўперад, толькі прыцэльны і бесперабойны агонь стрымліваў іх.

Пяць контратак давялося адбіць у той дзень абаронцам вышыні. Шмат гітлераўцаў засталося ляжаць пад ёй.

47. Зак. 808.

Калі падыйшла дапамога, і гітлераўцы пакаціліся ад вышыні прэч, Уладзімір звярнуў увагу на параненую нагу. Яна здранцвела, апухла. Камандзір роты адправіў байца ў медсанбат.

Пасля гэтага бою Карнеенку ўзнагародзілі ордэнам Славы III ступені. Ён знішчыў болын за 40 гітлераўцаў і варожы кулямётны разлік.

Нашы войскі вызвалялі ад захопнікаў беларускія гарады і вёскі. Людзі з радасцю сустракалі салдат, частавалі іх яйкамі, свежым малаком, салам, шчыра дзякавалі за вызваленне.

У сакавіку 1944 года дывізія, у якой ваяваў Карнеенка, ужо дзейнічала на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Цёплым веснавым днём чырвонаармейцы выбілі ворага з парослай дробным ядлоўцам вышыні каля вёскі Красніца. Фашысты рашылі адваяваць страча- ныя пазіцыі, згрупавалі сілы і пайшлі ў наступление. Засакаталі кулямёты, забухкалі выбухі снарадаў. Першая атака гітлераўцаў была адбіта. Яны залипли, праз некалькі хвілін зноў паўзлі ў бок вышыні пры падтрымцы артылерыйскага агню.

Карнеенка размясціўся са сваім «максімам» ля раскідзістага куста ядлоўцу, які хаваў яго ад варожага вока. Але кулі, бы раззлаваныя пчолы, пагрозліва гулі над галавой. Раптоўны боль у руцэ прымусіў Уладзіміра на момант адарвацца ад кулямёта. Набрыняў крывёй рукаў шыняля, рана крывавіла. Адна куля прайшла руку навылёт каля пляча, другая - ніжэй локця. Рука зрабілася быццам не сваёй, адзервянела і бездапаможна павісла.

У тэты час немцы зноў кінуліся ў атаку. Што рабіць? Не было ні страху, ні разгубленасці. Кулямёт Карнеенкі клаў фашыстаў у снег, прымушаў іх адпаўзці. Страляў воін адной рукой. Амаль двое сутак штурмавалі гітлераўцы вышыню. І двое сутак паранены і аслабелы Уладзімір не пакідаў сваёй пазіцыі. Калі фашысты адступілі, страціўшы надзею захапіць перакапаную мінамі і снарадамі вышыню, Карнеенку знайшлі санітары...

За і'эты бой Уладзімір Якаўлевіч быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступень Потым была яшчэ адна ўрадавая ўзнагарода. За вoi некую кемлівасць, мужнасць і гераізм камандзір стралковага палка асабіста прымаца- ваў да гімнасцёркі Карнеенкі ордэн Чырвонай Зоркі.

У ліпені 1944 года акружаныя нашымі войскамі на подступах да Мінска, у Лагойскім раёне, 10 нямецкіх дывізій спрабавалі вырвацца з акружэння. Мала даводзілася адпачываць у гэтыя дні нашым воінам. У Карнеенкі пажаўцеў твар, слязіліся вочы. Але баец адганяў стому. Кулямётчыкі адбівалі шматлікія танкавыя атакі ворага, вытрымлівалі артабстрэл, рассейвалі варожую пяхоту. У баях за знішчэнне нямецкай групоўкі войск Уладзімір Якаўлевіч паказаў сапраўдны гераізм, умение арыентавацца ў самых складаных абставінах, вытрымку. За баі на Лагойшчыне Уладзімір Якаўлевіч атрымаў ордэн Славы I ступень

У цяжкіх баях на тэрыторыі Польшчы мужны кулямётчык быў паранены, лячыўся ў шпіталі. Пасля выздараўлення апынуўся ля сцен Кёнігсберга, дзе прымаў удзел у штурме варожай цытадэлі. Давялося Карнеенку пабываць і на Далёкім Усходзе, ваяваць з японскімі мілітарыстамі.

У родную вёску Губіншчына Уладзімір Якаўлевіч вярнуўся ў 1945 годзе. Ідучы па вуліцы, уважліва агля-

даў напоўразбураныя хаты вёскі, спаленыя фашыстамі і зарослыя непралазнай крапівой дварышчы і думаў аб тым, колькі сіл трэба ўкласці ў аднаўленне роднага селішча. Партызана і франтавіка чакалі нялёгкія працоўныя будні.

*З.М. Скачкова.*

## Баявы шлях артылерыста

Шасцю ордэнамі адзначаны баявы шлях маёра-артылерыста Уладзіміра Акімавіча Сілкіна. Ён ваяваў усю Вялікую Айчынную вайну, з першага і да апошняга дня. Тры гады і восем месяцаў на перадавой. А пачынаў салдатам у далёкім 1939-м. За плячыма было 8 класаў Крычаўскай сярэдняй школы і 2 курсы фізкультурнага тэхнікума.

Спартсмен, удзельнік Усесаюзнага парада фізкультурнікаў 1939 года, Уладзімір цалкам адпавядаў патрабаванням, якія прад'яўляліся да курсантаў ваеннага вучылішча, таму і быў накіраваны ў адно з іх пасля года службы ў 27-м горна-кавалерыйскім палку, які базіраваўся ў Самаркандзе.

Вучыцца ў Пензенскім артылерыйскім вучылішчы трэба было два гады, але вайна скараціла гэты тэрмін удвая. У самым пачатку ліпеня 1941 года з ліку курсантаў адабралі 20 чалавек, якія да паступлення ў вучылішча служылі ў арміі, прысвоілі ім званне «лейтэнант» і накіравалі ў баявыя часці. Сярод іх быў і Сілкін. Так 85-ы полк 100-й стралковай дывізіі Паўднёва-Заходняга фронту папоўніўся маладым камандзірам супрацьтанкавай батарэі. Баявое хрышчэнне Уладзімір прыняў на Украіне, над Белай Царквой.

— Бітва была цяжкай і кровапралітнай,— успамінае ветэран. — З-за клубаў дыму і пылу не было бачна сонца. Стрэлы і выбухі чуліся з усіх бакоў. Варожая пяхота пры падтрымцы танкаў бесперапынна лезла на нашы пазіцыі, а ў тыле дзейнічалі атрады дыверсантаў. Выстаяць супраць такой навалы было немагчыма, і першы бой закончыўся акружэннем...

Сем сутак блукаў лейтэнант па варожых тылах, далёка абыходзячы цэнтральныя дарогі і буйныя вёскі, аднак сорак байцоў сабраў і да лініі фронту вывеў. І трэба ж было так здарыцца - трапіў якраз у свой полк.

—Другі раз з акружэння выходзілі на працягу ўсяго снежня ў складзе трох палкоў. Цяжка было, але вырваліся. А 19 студзеня 1942 года паблізу невялікага украінскага сяла мая батарэя была разбіта,—кажа Уладзімір Акімавіч. - Засталіся дзве гарматы і чалавек восем байцоў. Я атрымаў кулявое і асколачнае раненні. Слабаватымі аказаліся нашы «саракапяткі» супраць танкавых гармат. У шпіталь трапіў туды, дзе пачынаў службу - у Самарканд. Пасля выздараўлення, як і ўсе афіцэры 100-й дывізіі, якая першай атрымала ганаровае званне гвардзейскай, паехаў у Маскву за назначэннем. Накіравалі ў 416-ы асобны артылерыйска-кулямётны батальён 115-га ўмацаванага раёна, байцоў якого пра- звалі смертнікамі. Стаялі пад Масквою, у Падольску. А як толькі пачалі- ся баі пад Сталінградам, нас кінулі туды. Я атрымаў батарэю гармат калібру 76 мм. Гэта ўжо была салідная зброя, з ёю можна было процістаяць нямецкім танкам.

Іх мы сустрэлі на Мамаевым кургане. Загад абвяшчаў: «Ні крону назад! За Волгаю для вас зямлі няма!» Баі былі жорсткімі, работы для маіх гармат хапала. Вораг таксама не драмаў, рабіў за дзень на 500 самалёта-вылетаў і скідваў на нашы пазіцыі сотні тон смертаноснага грузу. Бамбіў з нямецкай пунктуальнасцю з 8 да 18 гадзін. Спрабаваў уздзейнічаць і на псіхіку байцоў, скідваючы з самалётаў парожнія бочкі з-пад паліва і кавалкі чыгуначных рэек, якія з прарэзлівым завываніем ляцелі на зямлю. Але байцы хутка прывыклі да гэтай «музыкі».

Нашы гарматы стаялі за 200 метраў ад нямецкіх акопаў - так было бяспечней, бо палова скінутых с іхніх самалётаў бомбаў трапляла на галовы іхніх жа салдат. Паміж нашымі і варожымі дзотамі было каля 50 метраў, і байцы перакідваліся гранатамі. Здаралася, што немцы знаходзіліся зусім побач, у суседнім пакоі занятага дома. Спрабавалі мы і атрымліваць ад немцаў «падарункі». Справа ў тым, што акружаную нямецкую групіроўку забяспечвалі ўсім з паветра з надыходам цемры. Куды скідваць, ворагі паказвалі ракетамі. Нашы байцы хутка сцямілі, у чым справа, і таксама пачалі выстрэльваць ракеты, як толькі чулі ў паветры гукі матораў. А потым збіралі мяшкі з каўбасой і кантэйнеры з кансервамі, шакаладам і вітамінамі. Аднойчы немцы скінулі нам ажно 8 пасылак.

Пяць месяцаў мы адбылі ў самым пекле і, як ні дзіўна, батарэя не страціла ніводнага чалавека, нават параненых не было. Усе салдаты і афіцэры былі ўзнагароджаны. Ордэн Чырвонай Зоркі атрымаў і я, разам з выклікам у сталіцу. Там мне даручылі фарміраванне артдывізіёна 506-га асобнага артылерыйска-кулямётнагабатальёна, які потым атрымаў назву «Гомельскі»...

Наперадзе была Курская дуга, потым вызваленне роднай Беларуси Артдывізіён старшага лейтэнанта Сілкіна прымаў непасрэдны ўдзел у аперацыі «Баграціён».

—Агнявую пазіцыю займалі пад Рагачовам, — працягвае свой расказ ветэран. У час падрыхтоўкі аперацыі я змог пабываць у Крычаве, сустрэцца з роднымі: два дні даў мне на тэта камбат. Пасля сустрэчы і ваяваць стала лягчэй.

Аперацыя «Баграціён» пачалася артпадрыхтоўкай, якая працягвалася каля дзвюх гадзін. Глыбокаэшаланіраваная абарона фашыстаў была ўзламана, і наша войска перайшло ў імклівае наступление. Лета 1944-га было, як дзве кроплі вады, падобнае на лета 1941-га, толькі адступалі ўжо немцы...

Беларусь была вызвалена, а на кіцелі афіцэра-артылерыста заззяў ордэн Аляксандра Неўскага. За фарсіраванне Віслы ён быў адзначаны ордэнам Айчыннай вайны II ступени

— Па Полылчы і Усходняй Прусіі салдаты ўжо не ішлі, а ехалі, хто на чым, — кажа Уладзімір Акімавіч, — Машыны, матацыклы, павозкі, веласі- педы адзінай лавінай рухаліся на Берлін, і спыніць гэту лавіну было не- магчыма. Здаралася, што раптам на дарогу выходзіла ўзброеная варожая калона, і тады ўспыхваў кароткі бой...

Так артдывізіён Уладзіміра Акімавіча прайшоў да ўзбярэжжа Балтыкі і спыніўся насупраць Шчэціна, закрыўшы выхад з заліва ў мора. Прыцэльным агнём гармат было патоплена пяць варожых бранякатэраў і адзін параход. За тэта храбры афіцэр, які яшчэ ў школьныя гады, не задумваючыся, мог

выступіць і супраць пяці крыўдзіцеляў, атрымаў ордэн Айчыннай вайны I ступені. А дывізіён перакінулі на раку Нейсе. 2 мая 1945 года байцы прайшлі міма Берліна і накіраваліся да ракі Эльбы.

Цяжкая і кровапралітная вайна закончылася доўгачаканай перамогай над ворагам. Салдаты і афіцэры раз’ехаліся па дамах, іх чакалі фабрыкі, заводы і калгасныя палеткі, а Уладзімір працягваў служыць да 1957 года. У 1947 годзе яго знайшоў яшчэ адзін ордэн Чырвонай Зоркі, а другі ордэн Айчыннай вайны I ступені Уладзіміру Акімавічу ўручаны ўжо ў наш час.

Ёсць у ветэрана і больш дзесятка медалёў, у іх ліку «За абарону Сталінграда», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

*А. Балдоўскі.*

## Дарогі салдацкія

Сямён Васілевіч нарадзіўся ў вёсцы Чырвоная Буда. Тут закончыў сельскую школу. У 1936 годзе быў прызваны ў Чырвоную армію. Служыў у гарадах Вялікія Лукі і Ленінградзе. Прымаў актыўны ўдзел у барацьбе супраць белафінаў. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях, М.І. Калінін уручыў яму медаль «За адвагу». Сямёну Васілевічу Тарасенку тады ж было прысвоена званне лейтэнанта.

У Вялікую Айчынную вайну Тарасенка з першых дзён на фронце, на ленінградскім напрамку. Фашысты ўпарта наступали Артылерысты не мелі перадышкі. Пад Ленінградам Сямён Васілевіч атрымаў цяжкае ранение, у асаджаным горадзе яму зрабілі аперацыю і па Ладажскім возеры пераправілі ў Свярдлоўскі шпіталь.

Калі раны былі залечаны, Тарасенку прапанавалі нестраявую службу ў тыле. Але не згадзіўся лейтэнант. Ён піша рапарт за рапартам аб адпраўцы на фронт. Настойлівасць узяла верх. Сямёна Васілевіча прызначылі каман- дзірам батарэі 373-га стралковага палка дывізіі войск НКВД. Байцы дывізіі грамілі гітлераўцаў на Арлоўска-Курскай дузе, вызвалялі ад акупантаў старажытны рускі горад Ноўгарад-Северскі, беларускія гарады Гомель і Жлобін, украінскія гарады Сарны і Ковель. Дывізія першай уварвалася ў польскі горад Люблін. Змагалася под Брацілавай, брала германскія гарады Кюстрын, Патсдам, Берлін. I на ўсіх гэтых франтавых дарогах, фарсіруючы вялікія і малыя рэкі, у дождж і завіруху, у спёку і лютыя маразы агнём падтрымліваў пяхоту артылерыйскі дывізіён С.В. Тарасенкі.

15 студзеня 1945 года артылерысты Тарасенкі прынялі ўдзел у рэйдзе па тылах ворага. Цяжкім быў гэты рэйд. Але салдаты выканалі пастаўленую перад імі задачу.

— Наступіў сакавік 1945 года, — успамінае С.В. Тарасенка. - Фарсірава- на рака Одэр у раёне Кюстрына. Удар быў настолькі моцным і нечаканым, што гітлераўцы адкаціліся ўглыб на 8 кіламетраў пры шырыні прарыву ў 20 кіламетраў. Але апамятаўся вораг. Яго контратакі следавалі адна за другой. Пазіцыі нашы аказаліся нявыгаднымі. Балоцістая мясцовасць не дазваляла глыбока акапацца. Нягледзячы на гэта, мы працягвалі ўтрымліваць плацдарм. У красавіку гітлераўцы падцягнулі да

плацдарма вялікія сілы пяхоты і танкаў. Яны рашылі адным ударам пакончыць з намі. Дні і ночы не змаўкала кананада. І хоць нас засталося мала, вораг не прайшоў.

Маёр Тарасенка ўдзельнічаў у апе-рацыі па акружэнню Берліна і закончыў вайну на беразе ракі Эльба.

Радзіма высока ацаніла баявыя подзвігі Сямёна Васілевіча Тарасенкі. Ён узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Ай-чыннай вайны І ступені, ордэнамі Ай-чыннай вайны ІІ ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

*Н.М. Марозава.*

## Аб чым пісала раённая газета «Шлях сацыялізму»

**Апраўдаем аказаны гонар!**

У гарачы жнівеньскі дзень, у самы разгар работы, калгаснікі сельгасарцелі «Шлях да камунізму» пачулі радасную вестку - за паспяховае заканчэнне жніва азімых іх калгас, а таксама пяць лепшых калгасніц-жней, занесены на раённую Дошку Гонару. 3 гэтай весткай да іх прама на поле прыйшлі старшыня калгаса Новікава і настаўніца-агітатар Паўлоўская.

Тут жа адбыўся мітынг. Адна за другою выступалі калгасніцы, прозвішчы якіх былі занесены на Дошку Гонару. У сваіх выступлениях жнеі-ударніцы заявілі: «Памножым свае сілы і энергію, каб даць краіне і фронту больш прадуктаў харчавання. Зробім усё, што залежыць ад нас, каб наблізіць дзень сканчэння вайны. Высокі гонар, аказаны нам, мы апраўдаем!».

Пасля заканчэння мітынгу калгасніцы з яшчэ большим энтузіязмам узяліся за работу.

*М. Язерская, калгас «Шлях да камунізму» Касцюшкавіцкага с/с.*
*1944 г., 20 жніўня.*

**Першы хлеб - дзяржаве**

Сельгасарцелі Паланіцкага сельсавета адначасова з жнівом і малацьбой шырока разгарнулі продаж хлеба дзяржаве. Калгас «Ленінскі прызыў» не толькі ліквідаваў сваё часовае адставанне па жніву, але і здаў ужо дзяржаве 6 тон збожжа новага ўраджаю. Калгас «Чырвоны май» завёз на прыёмачны пункт 8 цэнтнераў зерня, сельгасарцель «2-я пядігодка» - 500 кг, «Новае жыццё» - 500 кг. Прыступілі да продажу хлеба дзяржаве і іншыя калгасы сельсавета.

Усяго па сельсавету ўжо прададзена болын 9 тон зерня.

*Т. Кубека, старшыня Паланіцкага сельсавета, 1944 г., 20 жніўня.*

## Камісар дывізіі

Гэтага ветэрана са шматлікімі ўзна-городамі на пінжаку можна было ўба-чыць у Крычаве пад час усіх знамя-нальных для горада дат. Быў ён на яго 850-годдзі, завітаў на 50-годдзе вызва-лення ад нямецка-фашысцкіх захоп-нікаў.

Адкуль у масквіча, палкоўніка ў ад-стаўцы Аляксея Міхайлавіча Міхай- лава такая навага да Беларусі і любоў да аднаго з яе райцэнтраў?

Былы начальнік палітаддзела 385-й гвардзейскай Чырванасцяжнай ордэна СувораваІІступені стралковай дывізіі разам з байцамі і афіцэрамі ў 1943-1944 гадах вызваляў беларус-

кую зямлю ад нямецка-фашысцкай навалы, а Крычаў быў першым горадам на іх шляху. Вось і парадніўся з таго часу ветэран з райцэнтрам. Ён дапамог членам клуба інтэрнацыянальнай дружбы СШ № 6 і яго адказнаму арганізатару З.А. Усацікавай стварыць у школе пакой баявой славы дывізіі. Вялікая дапамога аказана ім і краязнаўчаму музею.

... Усяго два месяцы спатрэбілася камандаванню, каб сфарміраваць у 1941-м годзе ў сонечнай Кіргізіі 385-ю стралковую дывізію. Яна была сапраўды інтэрнацыянальнай. Таджыкі, туркмены, узбекі, казахі і кіргізы мужна змагаліся побач з рускімі, украінцамі і беларусамі. Былі таксама прадстаўнікі іншых народаў, бо бяда была агульнай і вораг для ўсіх адзіны. Ад Фрунзе да Эльбы прайшла дывізія, пакрыўшы свой сцяг нязгаснай славаю. Стала гвардзейскай, была ўзнагароджана ордэнамі Чырвонага Сцяга і Суворава II ступені, а за вызваленне нашага горада атрымала ганаровае найменне «Крычаўская».

Вось у гэтую дывізію ў чэрвені 1943 года і быў накіраваны Міхайлаў для праходжання службы ў якасці начальніка палітаддзела. Яму, кадраваму ваеннаму, тады было 30. У арміі служыў з 1936 года. За плячыма - Ваенна-палітычная акадэмія імя У.І. Леніна. На фронце з першых дзён вайны: камісар, начальнік палітаддзела.

385-я дывізія трымала абарону каля г. Людзінава, што ў Калужскай вобласці. Менавіта адтуль прайшоў Аляксей Міхайлавіч да Эльбы - за мужнасць атрымаў высокія ўрадавыя ўзнагароды: тры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэны Айчыннай вайны I і II ступеням Чырвонай Зоркі і шматлікія медалі.

Былы камандзір узвода малодшы лейтэнант Ф.А. Кандраценкатак характарызуе палкоўніка: «...Усе, каму давodзілася сустракацца з начальнікам палітаддзела дывізіі, вельмі паважалі яго. Гэты валявы чалавек заўсёды гаварыў праўду. Ён умеў пераконваць людзей, усяляць упэўненасць і надзею. Тактоўны і заўсёды добразычлівы з дысцыплінаванымі салдатамі, ён быў строгі з тымі, хто парушаў дысцыпліну. Байцам падабалася, што ён быў заўсёды бадзёры, чыста паголены і ў акуратнай форме. Ужо адзін выгляд камісара, не кажучы пра асабістую дысцыплінаванасць, выклікаў у чырвонаармейцаў павагу, яны былі гатовы ісці за ім у любое пекла. Палкоўнік мог паказаць уласным прыкладам, як трэба выконваць нялёгкую ваенную справу, бо меў не толькі вышэйшую ваенную адукацыю, але яшчэ і вялікі баявы вопыт.

Аднойчы ў час перапынку паміж баямі байцы заўважылі, што на ўзлеску спыніўся бронетранспарцёр. Праз некалькі хвілін у траншэі апынуўся начальнік палітаддзела. Ён прывітаўся і адразу пачаў цікавіцца здароўем, настроем байцоў, распытваць пра абстаноўку на ўчастку. Толькі пагаварыць па душах не давялося - перашкодзілі немцы. Яны каторы раз запар пайшлі ў атаку. Тады палкоўнік падышоў да супрацьтанкавага ружжа і пачаў, не спяшаючыся, умела абстрэльваць варожыя бронемашыны з пяхотай. Вёў агонь з намі, пакуль атака не захлынулася».

Праз усю Беларусь прайшла «Крычаўская», вызваляючы яе гарады і вёскі. Толькі пад Чавусамі давялося затрымацца на цэлых 9 месяцаў. Спроба фарсіраваць раку Проня 2 кастрычніка 1943 года поспехам не завяршылася, і быў аддадзены загад перайсці

да назіцыйнай абароны. Так званыя баі мясцовага значэння працягваліся да 25 чэрвеня 1944 года. У тэты дзень Чавусы ачысцілі ад захопнікаў.

Пасля Беларусі дывізія ступіла на польскую зямлю. Яна штурмавала гарады і крэпасці Асавец, Астраленка, Ломжа. Пачынаючы з чэрвеня 1944 года да канца вайны Вярхоўны Галоўнакамандуючы аб'яўляў ёй падзякі 12 разоў.

... Апошнюю кропку ў той кровапралітнай вайне палкоўнік Міхайлаў паставіў на Эльбе. Там наша 385-я гвардзейская сустрэлася з амерыканскай 82-й иаветрана-дэсантнай дывізіяй. Колькі бало радасці. Байцы і афіцэры абедзьвюх дывізій частавалі адзін аднаго. На адным з прыёмаў камандаванне саюзнікаў уручыла групе савецкіх афіцэраў воінскія ўзнагароды ЗША. Сярод узнагароджаных быў і Міхайлаў, які атрымаў ордэн Вышэйшага афіцэрскага гонару. Гэты пяцікантовы крыж знайшоў сваё месца сярод шматлікіх узнагарод афіцэра, як пацвярджэнне яго баявых заслуг.

*А. Балдоўскі.*

## Штурман бамбардзіроўшчыка

В августе 1940 года в Харьковское авиационное училище прибыла группа ребят из города Кричева и района. Они только что окончили среднюю школу и были призваны в Красную армию. Приехал и Михаил Кустрей из деревни Сокольничи, окончивший среднюю школу в д. Хотиловичи. Всего белорусов было восемьдесят три человека.

Прошел трудный, напряженный год ускоренной боевой подготовки. Армейская служба помогла Михаилу стать настоящим солдатом. С детства он много работал с отцом и в поле и дома. 8 июля 1941 года, когда уже шла Великая Отечественная война, отличник боевой подготовки Михаил Захарович Кустрей стал штурманом дальнего бомбардировщика, старшим сержантом 285-го скоростного бомбардировочного полка. Полк тогда располагался в знаменитых гоголевских местах, в Миргороде.

Пришел приказ вывезти из Полтавы двадцать пять летчиков, вышедших из вражеского окружения. Они были нужны армии. Итак, двадцать пять товарищей по оружию, да еще пять членов экипажа бомбардировщика. Самолет прибыл в срок и точно туда, где его ждали. Молодой штурман М. Кустрей свое дело знал отлично. Но только взлетели, как столкнулись с фашистскими истребителями. Прикрыть бомбардировщик было некому. Гитлеровцы расстреляли машину на взлете. Самолет развалился пополам и загорелся. Михаил Кустрей и еще несколько человек спаслись чудом, но у них были сильные ожоги и тяжелые ранения. Лечили Михаила в Харькове. Врачи сами не очень надеялись на успех лечения. Мучило и тяжелое ранение в руку - вынули кость от кисти до локтя. Рана заживала медленно. Поправился, стал выходить на прогулку. Однажды встретилась на пути женщина-военврач. Знакомое лицо. Остановился. И сказал ей:

— Я Михаил Кустрей из Сокольнич. А Вы доктор Киселёва из Кричева? Узнал свою землячку.

—Да, я доктор Ольга Киселёва.

Военврач Киселёва помогла Михаилу попасть в один из военных госпиталей в Рубцовске на Алтае. Снова больничная палата. Потом пришел день, когда его выписали как инвалида. Посоветовали искать работу по силам. Михаил пошел к медицинскому начальству. Объяснил, что он знает, что такое война и хорошо изучил авиационное дело, любит его и не желает уходить из авиации. Генерал, начальник медицинской службы, посмотрел на старшего сержанта с удивлением: ведь фактически без руки. Какая тут боевая авиация.

И все-таки в авиаотряде появился старший сержант М.З. Кустрей, которому поручили преподавать штурманское дело. Преподавал успешно, хотя и не имел офицерского звания. Потом пришлось летать на машинах, выполнявших особые задания. Совершал полеты из Москвы на фронт с пассажирами, за которыми охотилась и фашистская разведка и гитлеровские летчики-истребители. Например, во время Ясско-Кишиневской битвы штурман М. Кустрей прокладывал курс для самолета, на котором летели из столицы на юго-запад командующие фронтов И.С. Конев и Ф.И. Толбухин, маршал С.К. Тимошенко, представитель Ставки. Конечно, впереди и над ними шли истребители прикрытия. Но все равно ответственность на штурмана ложилась огромная. Нельзя было допустить малейшей ошибки - точно по курсу должен идти самолет. С ним летал из Москвы в Берлин первый комендант поверженной фашистской столицы — Берлина — генерал Н.Э. Берзарин. В «полетной книжке» штурмана М.З. Кустрея, которую он подарил Кричевскому краеведческому музею, записаны сотни часов особо важных полетов и вылетов по специальному заданию.

Однажды командир части сказал Михаилу Захаровичу, что нужно срочно доставить в Будапешт известного писателя и поэта, военного корреспондента. Пассажир подошел к самолету и подал руку:

—Константин Симонов, специальный корреспондент «Красной Звезды».

Человеком он был интересным. Много спрашивал, сам кое-что рассказывал. Его интересовали полеты дальнего бомбардировщика, отдельные эпизоды.

После победы Михаил Захарович вернулся в родные Сокольничи. Работал в этой деревне сельским библиотекарем. Потом стал отличным преподавателем военного дела в школе. Его труд отметило Почетной грамотой командование Белорусского военного округа.

*М.Ф. Мельников.*

*З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.*



К.М. Сіманаў.

## Лісты з фронту

У фондах нашага краязнаўчага музея захоўваюцца рэліквіі ваеннага часу - лісты з фронту. Частка іх была апублікавана ў раённай газеце ў 1943- 1944 гадах. Вось некаторыя з іх.

### З фронту землякам

Я, стары салдат, удзельнік трэцяй вайны, у дзень гадавіны вызвалення горада і раёна ад гітлераўскіх захопні- каў дасылаю гарачае прывітанне землякам-крычаўцам.

Азіраючыся назад, сёння міжволі ўспамінаю 1941 год, калі гітлераўскія рабаўнікі, як саранча, накінуліся на нашу краіну. З болем у сэрцы пакідалі тады мы, воіны Чырвонай арміі, родную старонку. Але верылі, што пройдзе час - мы вернемся. Нялёгкую школу, вялікі шлях прайшоў я за гэтыя гады. У многіх баях прымаў удзел, шмат чаму навучыўся і заўсёды верыў у перамогу. Калі радыё прынесла вестку аб вызваленні роднага горада ад гітлераўскай навалы, сэрца маё напоў- нілася радасцю, яшчэ з большым імкненнем ірваўся я ў бой.

Ззаду засталіся квітнеючыя палі і сады Украіны. Наперадзе - абрабаваная, прыгнечаная Чэхаславакія, народы якой чакалі нашай дапамогі, а за ёю - фашысцкае логава. Хутка будзе ён трымаць адказ за ўсе свае злачынствы.

*П.С. Ільін.*

### Яфрэйтар Баларчанка

Ішоў бой за вышыню над пераправай. Немцы напружвалі ўсе сілы, каб спіхнуць нашых байцоў у раку. Паранены камандзір узвода і кулямётчык Сцебуноў які ляжыць побач.

—Памрэм, а вышыню не здадзім! - крыкнуў яфрэйтар Баларчанка. Ён прыняў на сябе камандаванне ўзводам і лёг за кулямёт.

Немцы ўсё бліжэй. Але нашы бай- цы маўчаць. Толькі тады, калі гітлераўцы падыйшлі на 50 метраў, застрачыў кулямёт Баларчанкі. Яго дружна падтрымалі ўсе байцы. Фашысты пачалі падаць на зямлю адзін за другім. Тады падняўся Баларчанка і скамандаваў:

—Узвод, наперад, у атаку! Ура!

Байцы лавінаю панесліся на немцаў. Гітлераўцы пачалі разбягацца. Баларчанка дагнаў варожага афіцэра і захапіў яго ў палон.

Сяржант А. Смірноў.

Перадрукавана з газеты «Баявы сцяг». Яфрэйтар І.К. Баларчанка - калгаснік сельгасарцелі «Ударнік Крычаўшчыны».

*Падрыхтавала да друку*
*Н.М. Марозава.*

*З фондаў Крычаўскага раённага краязнаўчага музея.*

## Франтавыя шляхі камандзіра-танкіста

Слаўны баявы шлях прайшоў Сяргей Цімафеевіч Стызік. Сем разоў за гады вайны ўпаміналася яго прозвішча ў загадах Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Сяргей Цімафеевіч нарадзіўся ў мястэчку Крычаў у 1905 г. Сям'я была вялікая і асаблівым дастаткам не вызначалася. Гэта дрэнна адбілася на здароўі дзяцей. У сям'і Цімафея Піліпа- віча іх памерла чацвёра.

Адна бяда не ходзіць. У 1913 г. зга-

рэла сядзіба, потым быў смяротна параненны на паляванні бацька.

У 1917 г. Сяргей закончыў царкоўнапрыходскую школу і паступіў у гімназію імя Гардзеевай. Яна праіснавала да восені 1918 г., затым былаператворана ў школу, якой надалі імя Чэхава. У восьмым класе хлопец уступіў у камсамол, у 1924 г. скончыў 10 класаў. Спачатку дапамагаў сям'і па гаспадарцы, пазней уладкаваўся працаваць тэхнічным сакратаром райкома. У 1927 г. яго прынялі ў партыю і перавялі на пасаду загадчыка сакрэтнай часці акруговага выканкома.

Работа патрабавала болын грунтоўных ведаў, і Сяргей вырашыў ехаць у Маскву, паступіць на рабфак. Не пастушу Вярнуўся дамоў і ўладкаваўся на будаўніцтва чыгункі Асіповічы—Рослаў. Працаваў слесарам, арматуршчыкам, дзяжурным памочнікам механіка на кесоннай станцыі. У кастрычніку 1928 г. быў прызваны ў армію, у восьмую авіябрыгаду, якая дыслацыравалася ў Гомелі. У арміі атрымаў званне малодшага тэхніка.

ГІасля дэмабілізацыі Сяргей паехаў у Днепрапятроўск і стаў працаваць на заводзе «Камінтэрн» слесарам. Тут жа закончыў рабфак і атрымаў накіраван- не на першы курс Днепрапятроўскага хіміка-тэхналагічнага інстытута. Але вучыцца ў ім не ўдалося. Лёс крута павярнуў у іншы бок. Сяргей скончыў Арлоўскае танкавае вучылішча, паступіў у Акадэмію матарызацыі і механізацыі Чырвонай арміі. У 1939 г. Сяргей Цімафеевіч стаў камандзірам батальёна танкавай брыгады, прымаў удзел у паходах на Заходнюю Украі- ну, у Букавіну і Малдавію, ваяваў у Фінляндыі.

Раніцай 22 чэрвеня 1941 г. 20-я танкавая дывізія была паднята па трыво- зе і рушыла ў раён г. Луцка. На наступ- ны дзень яна сустрэлася з варожымі часцямі. У чэрвені-жніўні дывізія вяла цяжэйшыя баі пад Луцкам, Роўна, Бродамі, Ноўгарад-Валынскім, Оўру- чам і Чарнігавам. У сярэдзіне верасня дывізію расфарміравалі. Сяргей Ціма- феевіч быў накіраваны пад Харкаў, дзе фарміравалася 14-я танкавая брыгада.

З дня стварэння брыгада вяла баі пад Харкавам, Чугуевам і Купянскам, ваявала на курскім напрамку. Сяргей Цімафеевіч Стызік камандаваў ёй з ліпеня 1942 г. Пасля Курскай дугі ён стаў намеснікам камандуючага 27-й арміі па бранятанкавых войсках. На гэтай пасадзе і закончыў вайну 5 мая 1945 года ў Аўстрыі.

На цяжкім баявым шляху камандзіра было шмат паспяховых апера- цый. Аб гэтым сведчаць шматлікія ўзнагароды палкоўніка: ордэн Леніна, два ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Суворава II ступені, два ордэны Айчыннай вайны I ступені, два - Чырвонай Зоркі, ордэны Кутузава II ступені, Багдана Хмяльніцкага II ступені і два ордэны Венгерскай Народнай Рэспублікі, а таксама болып за 10 медалёў.

*Н.М. Марозава.*

# Адплата

Ранняй вясной 1945 года ва Усходняй Прусіі ішлі жорсткія крovапралітныя баі. Гітлераўцы не аддавалі без бою ніводнага населенага пункта.

Бясстрашна змагаўся з ворагамі наш 17-ы гвардзейскі кавалерыйскі полк, у якім я быў кулямётчыкам. Аднойчы нашы пазіцыі атакавалі нямец-

кія самалёты. Скідвалі бомбы, стралялі з куляметаў. Камандзір куляметнага разліку старшы сяржант Косцін падаў каманду схавацца пад сценамі цагельнага завода. Мы кінуліся туды. Уваход аказаўся замураваным, прыйшлося паспешліва разбіраць перашкоду. Раскідалі дэментавыя палы, убеглі на тэрыторыю завода і ўбачылі страшную карціну.

Тэрыторыя завода была густа набіта цывільнымі людзьмі. Жанчыны, дзеці рознага ўзросту. Схуднелыя і знясіленыя, яны сустрэлі нас радаснымі крыкамі. Выразна чулася і мая родная беларуская мова. Гэта былі ўгнаныя немцамі ў няволю мірныя жыхары. Многія з іх не маглі ад слабасці рухацца і гаварыць.

Мы ўжо не думалі аб тым, як ратавацца ад бамбёжкі. Твары байцоў спахмурнелі, гнеўна заблішчэлі вочы. Кавалерысты імкліва кінуліся ў атаку і занялі горад Алынтайн. Гітлераўцы не чакалі нападу, мала каму з іх удалося ўцячы ад расплаты. Такой была наша помета ворагам за здзекі над мірнымі людзьмі.

*П.І. Налівайка.*

## Подзвіг сувязіста

У сакавіку 1944 года ішлі крывапралітныя баі на рацэ Проня пад Чавусамі. Цяжка даводзілася нашым байцам. Шмат работы было ў сувязістаў.

Працавалі і рацыі. Але варожыя пеленгатары засякалі радыстаў, і на ўчастак, дзе яны знаходзіліся, абрушваўся шквал артылерыйскага і мінамётнага агню.

У 3-й роде 718-га стралковага палка 139-й Рослаўскай дывізіі служыў наш зямляк Мікалай Галенка. У адзін з дзён, калі немцы вялі інтэнсіўны агонь, Мікалай рашыў папярэдзіць таварышаў з другой роты сувязі, каб яны, перадаўшы паведамленне па рацыі, неадкладна мянялі месца. Прыбег Мікалай на НП другой роты, дзе працавала рацыя, выкрыкнуў: «Хутчэй у запасны акоп! Нас засёк пеленгатар!». Пяць сувязістаў ледзь паспелі дабрацца да запаснога ўкрыцця. А месца, дзе яны толькі што знаходзіліся, накрылі фашысцкія міны.

Трэба было знайсці парыў на лініі, аднавіць тэлефонную сувязь. І Мікалай пабег уздоўж лініі, хаця немцы працягвалі весці агонь. Адчуў, як нешта моцна ўдарыла ў галаву, кроў заліла вочы. Дзе ўсё ж парыў? Хутчэй бы яго знайсці! Нарэшце знайшоў. Трацячы прытомнасць, Мікалай злучыў правады, і сувязь аднавілася.

Санітары знайшлі яго і адправілі ў медсанбат. Лячыўся ў шпіталях у Верамейках, Рославе, Новасібірску. Раненне аказалася сур’ёзным. У Новасібірску Мікалай Галенка атрымаў пісьмо ад свайго аднапалчаніна, які пісаў, што пра яго подзвіг быў артыкул у франтавой газеце і што ён прадстаўлены да ўрадавай узнагароды.

Узнагарода знайшла салдата праз 25 гадоў. У 1969 годзе Мікалаю Галенку, жыхару вёскі Дрожджанічы Маляціцкага сельсавета, уручылі медаль «За адвагу».

*Н.М. Марозава.*

## Не спалохалася смерці

9 мая 1945 года. Сонечны дзень, духмяны пах квецені, маладой лістоты і травы, бязвоблачнае, ціхае і цёплае неба. У тэты дзень медсястра Таццяна Пракопаўна Цімафеева знаходзілася на дзяжурстве ў шпіталі на тэрыторыі Германіі.

У палатах весяліліся. Нехта з раненых узяў у рукі гармонік, пачаліся танцы, загучалі песні. Ва ўсіх былі радасныя твары, іскрыліся вочы.

А за будынкам шпіталя ляжала замініраванае поле. Спяшаючыся дабіць немцаў, вайскоўцы не паспелі ачысціць яго ад смяротнай начынкі. І вось у самы разгар святочнага вяселля раптоўна грымнуў выбух. «Нехта падарваўся» - жахнулася адна з медсясцёр. Таццяна Пракогіаўна выскачыла на вуліцу. «Вярніся, там міны,» - крычалі ёй услед. Але яна не звяртала ўвагі на ўстрывожаныя галасы калег. Не палохаючыся варожых мін, падскочыла да акрываўленага байца і прынесла яго да сцен шпіталя.

Медаль «За баявыя заслугі» знайшоў Таццяну Пракопаўну Цімафееву ў Крычаве праз некалькі гадоў, калі яна працавала загадчыцай дзіцячых ясляў № 16.

*Д.Л. Юдзянкоў.*

## След вайны

Маладыя, бязвусыя юнакі, старыя і малыя, жанчыны і мужчыны, — усе сталі на абарону Айчыны ў тым далёкім 1941-м. Сярод абаронцаў быў і Іван Данілавіч Барысенка, які ваяваў у складзе 1-га батальёна 212-й стралковай дывізіі і прымаў удзел у вызваленні Крычава.

— 29 верасня быў моцны дождж, а затым ярка засвяціла сонца. Нашы войскі ўступілі ў Дзягавічы, Прахораўку, а затым у ноч на 30 верасня фарсіравалі Сож. Каля ваенкамата быў вялікі бой - успамінае І.Д. Барысенка.

Многае забываецца, але радасць удзячных крычаўлян ад сустрэч сваіх вызваленцаў назаўсёды засталася ў памяці франтавіка.

— Жыхары сустракалі нас з радасцю, дзеці падносілі кветкі, — працягвае размову Іван Данілавіч. — І гэта радасць з нашай перамогай дапамагала выжыць байцам, надавала сілы.

Цяпер і самі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай ужо болын спакойна, не так усхвалявана расказваюць пра гады ліхалецця. А тады кожны бой для байца быў барацьбой за жыццё — бегчы, паўзці, ісці, але любой цаной перамагчы і выжыць, дапамагчы свайму таварышу.

Ваеннае сяброўства — святое. З гадам! забываюцца аднакласнікі, забываюцца тыя, з кім калісьці разам працаваў. А тыя, з кім прайшоў доўгія вёрсты вайны, застаюцца ў памяці і ў сэрцах франтавікоў да апошняга дня жыцця. У Івана Данілавіча была добрая памяць на твары. І праз 10, 20 і больш гадоў камандзір батальёна І.С. Мыцык дасылаў на Крычаўшчыну, у пасёлак Літвінава, лісты з фотаздымкамі сваіх былых байцоў ад іх родных,

якія жадалі хоць нешта праведаць пра сыноў, братоў, мужоў, якія прапалі без вестак або загінулі. І даведаліся. Іван Данілавіч падрабязна пісаў пра былых аднапалчан. Успаміны на працягу многіх гадоў усё вярталі і вярталі яго ў ваенныя будні.

Зноў і зноў ён нраходзіў доўгімі ваеннымі дарогамі, нанова перажываў жорсткія баі, губляў сяброў...

—Трапілі мы ў акружэнне. Камандзір палка загадвае камандзіру батальёна: «Падбяры хлопца, які арыентуецца на мясцовасці, каб правёў абоз». Камсорг роты тады звярнуўся да мяне: «Сынок, трэба любой цаной правесці абоз». І я пабег. Пакуль збіралі абоз, немцы змянілі пазіцыю і атрымалася так, што мы нарваліся на іх. «Здраднік! Ён нас падвёў», — што толькі не гучала ў мой адрас. А я тады малады зусім быў, не вытрымаў і заплакаў, — прыгадвае Іван Данілавіч. - Але правёў абоз без страт. Камандзір пацалаваў мяне, а я зноў-такі не вытрымаў, плакаў і расказваў, як усё адбылося. Тады заступіўся за мяне камсорг.

На грудзях маладога байца заззяў медаль «За адвагу».

Мужнасць, адвага, барацьба за жыццё - усё было. І.Д. Барысенка вярнуўся з вайны з узнагародамі - атрымаў два медалі «За адвагу», ордэн Славы III ступені, ордэн Вялікай Айчын- най вайны I ступені, а затым яшчэ медаль «За вызваленне Варшавы».

Праз многа гадоў без утойвання, не саромячыся, шчыра адказаў на пытан - не:

— Страшна было. Жудасна. Пасля аргпадрыхтоўкі першай ішла пяхота. Ішла пад кулі. А перад атакай інпіыя трэсліся, а ў мяне мова аднімалася... Было ўсяк: вось бег чалавек - і раптам няма яго, загінуў, а ты бяжыш далей.

Напаткала варожая куля і Івана Данілавіча. Параненага накіравалі ў шпіталь. Там пазнаёміўся з медсястрой Ганнай.

— Чатыры з паловай гады мне пісьмы пісаў. Затым прыехаў — ні ён не знайшоў сабе пары, ні я, — далуча- ецца да размовы Ганна Сямёнаўна.

Мірнае жыццё пачалі разам. Двух сыноў і дачку выгадавалі Барысенкі. Цяпер у іх шасцёра ўнукаў. 36 гадоў Іван Данілавіч адпрацаваў на цэмент- ным заводзе, дзе былога франтавіка паважалі.

*Т.П. Іўкіна.*

# Змагаўся ў французскім Супраціўленні

«Ураджэнец в. Зарубец Крычаўскага раёна Казлоў Міхаіл Васілевіч, 1925 года нараджэння, у 1943 годзе быў арыштаваны гестапа і вывезены ў канцлагер на тэрыторыю Латвіі і Літвы. У 1944 годзе адпраўлены на тэрыторыю Бельгіі, дзе працаваў на шахце чорнарабочым, адкуль уцёк, і з 3 сакавіка 1944 года да 18 чэрвеня 1945 года знаходзіўся ў Францыі ў партызанскім атрадзе імя Чапаева...»

*З даведкі нам. начальніка ўпраўлення КДБ па Магілёўскай вобласці В. Арцыкова*

Нядаўна Міхаіл Васілевіч Казлоў атрымаў адразу дзве ўзнагароды за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў Вялікую Айчынную вайну. Спачатку з далёкага Парыжа прыслалі ветэрану ордэн «За заслугі ў партызанскім руху Францыі», а следам за ім - медаль «За адвагу» з Масквы. А ўсяго некалькі

гадоў назад яго нават не лічылі ўдзельнікам вайны, і ён страціў надзею на тое, што калі-небудзь зможа гэта даказаць...

Калі пачалася вайна, Мішу Казлову было 16 гадоў. Ён марыў стаць паэтам, а яшчэ вельмі любіў разам з сябрамі бегаць на «варшаўку» - дарогу, што злучала Брэст з Варшавай і Масквой. Хлапчукі глядзелі на аўтамабілі, якія ў даваеннай вёсцы былі янічэ рэдкай з'яваю.

Калі пачалася вайна, «варшаўка» стала аб'ектам пільнай увагі падлеткаў па інвіай прычыне. Па ёй адступалі нашы салдаты пад націскам гітлераўцаў, там стралялі. На кожным кроку валялася разбітая, абгарэлая тэхніка, можна было знайсці зброю і боепрыпасы.

Удзел Мішы ў вайне і начаўся з таго, што ён разам з аднагодкамі збіраў аўтаматы і вінтоўкі, патроны. Хлопцы надзейна хавалі іх, каб потым перадаць у партызанскі атрíад. Аднойчы ён нават дапамог захапіць нямецкую танкетку, якая аказалася вельмі дарэчы народным мсціўцам. Але ўсё тэта было не так ужо і страшна. Самыя вялікія выпрабаванні пачаліся пасля таго, як Мішу выдаў гестапа мясцовы правакатар.

За чарговую перадачу зброі партызанам Міша быў схоплены і зняволены ў Крычаўскай турме. Там яго білі і катавалі. Маці, калі прынесла сыну перадачу і ўбачыла яго, страціла прытомнасць. Начальнік турмы Лядаў жорстка распраўляўся з вязнямі.

Юнага падпольнчыка вывезлі з Крычаўскай турмы ў канцлагер «Провінішкі» ў Літве. Калі маці ў чарговы раз прыйшла адведаць сына, ёй сказалі, што Міша забіты. З той пары яе вочы былі поўныя слёз, але ў сэрцы была надзея, што ён жывы. І сын вярнуўся ў жніўні 1945 года. Вось толькі дарога да дому даўжынёй у два гады была цяжкай і страшнай...

З канцлагера ў Літве ён быў вывезены ў Бельгію, а потым у Францию, у канцлагер Ерувіль. Там Міхаіла чакала катаржная праца ў шахтах. Але юнак не змірыўся са становішчам раба. За калючым дротам ён прабыў усяго каля трох тыдняў, а потым уцёк разам з двума таварышамі.

Адзін з уцекачоў адразу ж быў забіты ахоўнікамі. Яго імя Міхаіл Васілевіч, на жаль, не памятае. Самому ж Казлову і Вікгару Прусаву, які зараз жыве пад Кіевам і з якім яны засталіся сябрамі на ўсё жыццё, удалося выратавацца. Уначы лясньімі сцежкамі яны дабраліся да адной вёскі, дзе сустрэлі ўдзельнікаў французскага Супраціўлення.

Так ён апынуўся сярод суайчыннікаў. Камандзірам партызанскага атрада, які насіў імя Чапаева, быў расіянін Ташкін. Атрад складаўся з байцоў розных нацыянальнасцей. Французаў было каля 300, а рускіх, беларусаў, украінцаў - 50 чалавек.

Мішу часта даводзілася хадзіць на баявыя заданні. Насіў у вёскі лістоўкі, удзельнічаў у дыверсіях на чыгунцы. Ён насыпаў пясок у буксы цягнікоў, што прыводзіла да пажару ў час руху. У партызанскім атрадзе Казлоў знаходзіўся да 18 чэрвеня 1945 года, атрымаў пасведчанне добраахвотніка-удзельніка партызанскага руху на тэрыторыі Францыі ў другую сусветную вайну.

З Францыі ў СССР Міша вярнуўся 25 ліпеня 1945 года. Аднак на радзіме атрыманы дакумент не быў узяты пад увагу. Нашых суайчыннікаў, якія змагаліся ў французскім Супраціўленні,

чамусьці да ўдзельнікаў вайны не адносілі.

Крыўдна, канечне, было Міхаілу Васілевічу, але ён ніколі не шкадаваў аб тым, што не выкарыстаў магчымасць пасяліцца ў Англіі ці ў ЗША. Ён хацеў жыць у той краіне, дзе нарадзіў- ся, дзе чакала яго маці, Васіліса Піліпаўна, чакала, нягледзячы на тое, што ўсе лічылі яе сына забітым.

Некалькі гадоў таму ў «Известиях» М. Казакову трапіла на вочы публікацыя, аўтар якой заклікаў адгукнуцца ўдзельнікаў французскага Супраціўлення. Міхаіл Васілевіч адгукнуўся і атрымаў статус удзельніка Вялікай Айчыннай вайны. Яму прадаставілі кватэру ў Брэсце, у Доме ветэранаў.

Атрымаў ветэран пісьмо і пасылку ад нямецкіх антыфашыстаў з арганізацыі «Максіміліян Колбе». Яны прасілі дараваць за тое гора, што фашысцкая Германія прынесла беларускаму народу і яму асабіста. І гэта пакаянне - найбольная ўзнагарода ветэ- рану.

*І. Варапаеў.*
*Член Савета ветэранаў г. Брэста.*

## Герой Аджымушкая

У Аджымушкайскіх каменяломнях здзяйсняў свой штодзённы подзвіг і наш зямляк Мітрафан Мікалаевіч Карпекін.

Нарадзіўся ён у 1908 г. у в. Варанёва. Рос у сялянскай сям'і, шмат дапамагаў бацькам па гаспадарцы. У 1924 г. у Крычаве пачалося будаўніцтва чыгункі, і сялянскі юнак становіцца будаўніком. Пасля завяршэння будоўді ён некалькі гадоў працаваў на чыгунцы - рамонтным рабочым, грузчикам. Пасля службы ў Чырвонай арміі вярнуўся на радзіму. І зноў уладкаваўся на будоўлю, разам з землякамі ўзводзіў Крычаўскі цэментны завод. На будаўніцтве праявілася творчая энергія, арганізацыйныя здольнасці М. Карпекіна.

Памятным быў 1932 год - яго накіравалі на вучобу ў рэспубліканскую партыйную школу. Неўпрыкмет праляцелі два гады вучобы. Мітрафана Мікалаевіча выбралі сакратаром партбюро Крычаўскага цэментнага завода, а ў 1935 г. - дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета.

Яго паважалі, з ім раіліся. У 1938 г. М.М. Карпекіна абралі першым сакратаром Крычаўскага райкома КПБ. На пачатку 1941 г. ён стаў сакратаром Магілёўскага абкома партыі па кадрах. На гэтай пасадзе яго і заспела вайна.

М. Карпекін у першыя дні вайны шмат зрабіў для стварэння падпольных груп і партызанскіх атрадаў, жадаў застацца ў тыле ворага і змагацца з фашыстамі. Але атрымалася інакш. Па распараджэнню ЦК Кампартыі Беларусі ён быў накіраваны на курсы ваенных камісараў у ваенную акадэ- мію імя Фрунзе, а ў сакавіку 1942 г. быў ужо на фронце. Яго прызначылі начальнікам аддзела кадраў танкавых войск Крымскага фронту. Пад час абароны Керчы ён быў у званні батальённага камісара.

У маі 1942 г. каля 10 тысяч абаронцаў Керчы спусціліся ў каменяломні і там працягвалі змагацца з ворагам. Пераадольваючы холад і голад, задыхаючыся ад атрутных газаў, каля 6 месяцаў байцы і камандзіры Чырвонай арміі вялі баі з фашыстамі.

Душой і арганізатарам гэтай барацьбы называлі выжыўшыя абарон- цы Аджымушкая Мітрафана Мікалаевіча Карпекіна. Як успамінаў старшы лейтэнант Паважны, ніхто не ведаў, калі ён адпачываў. Ён думаў толькі аб людзях, падтрымліваў іх маральна, падбадзёрваў. Пад яго кіраўніцтвам асаджаныя рабілі дзёрзкія вылазкі, наносілі ворагу ўдары.

Надышоў голад. Мізэрныя порцыі прадуктаў аддаваліся толькі паране- ным і хворым. Прыкладам у гэтым стаў батальённы камісар Карпекін.

Голад, хваробы і баі штодзень уносілі шмат жыццяў Людзей станавілася ўсё меней і меней. 13 кастрычніка 1942 г. памёр М.М. Карпекін. Знясіле- ныя абаронцы Аджымушкая ціха, без баявога салюту пахавалі яго ў адным з куткоў пячоры. Так абарвалася жыццё выдатнага чалавека і мужнага байца. Імя М. Карпекіна носіць адна з вуліц Крычава, а матэрыялы аб жыцці камісара захоўваюцца ў Крычаўскім краязнаўчым музеі.

*Н.М. Марозава.*

## Пад бамбёжкай, у пякельным агні

У час вайны я працавала ў ваенным шпіталі на Другім Беларускім фронце. У маі 1944 года атрымалі загад перабазіравацца з Калугі ў Беларусь. Накірунак - Магілёўская вобласць, станцыя Крычаў.

Разгортваць шпіталь давялося ў вёсцы Зуі, кіламетры за 2 ад станцыі. Хаткі ў вёсцы невялікія, параскіданыя ўсцяж ракі Сож. У іх ледзь расмясцілі аптэку, лабараторыю, склады і асабісты састаў.

А куды падзець раненых? Мы атрымалі паведамленне, што трэба іх наступления чакаць у самыя бліжэйшыя дні. Марудзіць было нельга. Трэба шукаць выйсце. Рашылі тэрмінова будаваць баракі. 3 чаго? Матэрыялаў няма і ўзяць недзе - вайна ж.

І надумалі. Лаза, гліна - вось з чаго можна зляпіць «карпусы». На сялянскіх лодках плавалі па рацэ Сож і секлі хмызняк. 3 яго плялі каркасы і абмазвалі глінай. Такім чынам за кароткі тэрмін узвялі тры вялікія баракі. Пакрылі іх саломай, брызентам. Унутры навялі чысціню і парадак. Устанавілі двухярусныя нары, замест дзвярэй навесілі коўдры.

Пачалі паступаць раненыя. Іх прымалі, аперыравалі, перавязвалі, размяшчалі па «палатах».

Па начах лятаЛі фашысцкія самалёты. Навешвалі на парашутах асвятляльныя ракеты, і вёсачка Зуі пад іх асляпляльным святлом у страху заміРала. Але ўсё неяк абыходзілася. Па ўсёй бачнасці шпітальныя баракі, падобныя на сельскагаспадарчыя службы, не прыцягвалі ўвагі.

А вось у ноч на 6 ліпеня не абышлося. Варожыя самалёты па сігналах лазутчыкаў атакавалі станцыю Крычаў, дзе ўсе пуці былі забіты эшалонамі з гаручым для авіяцыі, складамі боепрыпасаў, двума шпіталямі, саставамі бежанцаў, якія вярталіся ў вызваленыя раёны.

Нейкім цудам давялося адкаціць ад станцыі на некалькі кіламетраў эшалон з гаручым. Астатняе ўсё палыхала ў агні. Чуліся надрыўныя крыкі людзей, рык жывёлы. А дапамагчы людзям не было магчымасці. Станцыю ахапіла

мора агню, з грукатам ірваліся снарады, разлятаючыся далёка ад склада.

Аглушальныя выбухі шматтонных бомб страсалі наваколле. Валіліся вывернутыя з каранямі дрэвы. Станцыя ператварылася ў сапраўднае пекла.

Салдаты і афіцэры, якія наглядзелі- ся за вайну ўсялякага гора, згаджалі- ся, што такое ўбачыш не часта.

Усю ноч і наступнага паўдня гарэла станцыя Крычаў. Перад раніцай, калі бамбёжка спынілася, медыцынскі персанал нашага шпіталя прыступіў да аказання дапамогі пацярпелым. Выжыўшых везлі ў шпіталь. Там, у нацягнутай палатцы-перавязачнай, аперыравалі, перавязвалі. Месц у бараках не хапала, размяшчалі параненых прама на траве. Цяжка перадаць і забыць усё гэта.

У агні, ратуючы людзей ад смерці, загінуў начальнік матэрыяльнай часткі шпіталя Пенязь. Ён пахаваны на могілках у вёсцы Зуі.

*В. Літвінава.*

## Аб ім напісана ў кнігах

Мікалай нарадзіўся ў Крычаве, у сям'і тэхніка-будаўніка. Ен быў адным з лепшых спартсменаў у нашым горад- зе. Самымі любімымі відамі спорту былі для яго бег на доўгія дыстанцыі і бокс. На рэспубліканскіх спаборніцтвах баксёраў займаў прызавыя месцы.

Пасля школы Мікалай у Віцебску закончыў політэхнікум. Неўзабаве грымнула вайна.

... На адным з прыфрантавых аэрадромаў лётчык гутарыў з двума сваімі пасажырамі. Гэта былі савецкія разведчыкі. Задание іх было вельмі цяжкім. Безабаронны транспартны самалёт маглі перахапіць гітлераўскія сцярвятнікі, але лётчык справіўся выдатна. Два чэкісты, маёр і лейтэнант, былі перакінуты ў тыл ворага. Ім неабходна было прайсці вялікі шлях, ісці даводзілася толькі ноччу. Арыентаваліся па компасу і зорках. На чацвёртую ноч яны разышліся ў розныя бакі.

Аднойчы на перадавыя пазіцыі наглых войск выйшаў малады нямецкі афіцэр. На чыстай рускай мове ён папрасіў, каб яго неадкладна даставілі ў штаб фронту.

Прайшло шмат гадоў, і ў Мінску зноў сустрэліся былы маёр і былы лейтэнант, толькі лейтэнант стаў ужо падпалкоўнікам. Гэта быў той хлопец, які ў форме гітлераўскага афіцэра адправіўся за лінію фронту. Гэта ён быў адным з удзельнікаў аперацыі па адпраўцы з Мінска ў партызанскі лагер, а затым у Маскву, акадэміка М. Нікольскага. Выконваў разведчык і шмат іншых складаных заданняў. Ордэн Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, іншыя ўзнагароды сведчылі аб слаўных справах гэтага чалавека.

У 1976 годзе выдавецтва «Беларусь» выпусціла кнігу вядомага разведчыка І. Груздзева, выканаўшага ў вайну шэраг важных заданняў у тыле ворага на Віцебшчыне. Двойчы ў гэтай кнізе «У гады суровых выпраба- ванняў» упамінаецца імя лейтэнанта дзяржбяспекі Мікалая Фёдаравіча Мельнікава. Вось што расказваецца на старонках 56—60: «Вяржбіцкі быў накіраваны ў вёску Даўгавічы Смаленскай вобласці, куды з Савіна перабралася кіраўніцтва Віцебскай аператыўна-чэкісцкай трупы. Там на працягу

трох дзён з ім працаваў вопытны чэ- кіст, лейтэнант дзяржбяспекі Мікалай Фёдаравіч Мельнікаў. Ён даручыў Вяржбіцкаму разам з С.П. Бурлаковым арганізаваць у Віцебску дыверсійную трупу і вывесці са строю шэраг аб’ектаў ворага, у тым ліку склад боепрыпасаў на Маркаўшчыне, а таксама па- дабраць і падрыхтаваць сувязных з асоб, што працуюць ва ўстановах акупантаў.

Весткі, атрыманыя ад Вяржбіцкага, былі выкарыстаны кіраўніцтвам рэспубліканскай аператыўна-чэкісцкай трупы пры састаўленні дакладной запіскі камандуючаму войскамі Заходняга фронту Г.К. Жукаву. Да дакладной запіскі прыкладаліся тапаграфічныя карты і планы гарадоў, на якіх указваліся аб’екты ворага, выяўленыя разведчыкамі.

У кнізе пісьменніка І. Новікава «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» ёсць словы і аб аператыўным работніку Барысу. Прыведзена яго сапраўднае імя - Мікалай Фёдаравіч Мельнікаў.

Спартыўная падрыхтоўка часта выручала Мікалая ў час выканання важнага задания. Каля польскага горада Ломжа Мікалаю Фёдаравічу давялося болын за суткі праляжаць у замярзаючым балоце, але задание было выканана.

Летам 1944 года Мікалай Фёдаравіч працаваў намеснікам начальніка контрразведкі 5-й арміі. 3 войскамі гэтай арміі раней, 30 верасня 1943 года, ён вызваляў родны Крычаў.

Пасля перамогі над фашысцкай Германіяй Мікалай Фёдаравіч быў прызначаны начальнікам абласнога ўпраўлення КДБ у Гродна, удзельні- чаў у барацьбе з ляснымі бандамі.

12 мая 1953 года, у 38 гадоў, падпалкоўнік Мікалай Фёдаравіч Мельнікаў памёр. Далі знаць аб саберааны, падараванае здароўе на вайне. Ен пахаваны на могілках у Гродне.

*Н.М. Марозава.*

## Наш зямляк штурмаваў рэйхстаг

Раніца 30 красавіка 1945 года ўступіла ў свае правы. Дым і полымя вялікай бітвы ахапілі весь Берлін. Палкі 171-й стралковай дывізіі ўзялі штурмам некалькі дамоў на Альзенштрасэ. І калі салдаты пранікл<br>і ў дом, вокны якога выходзілі на Каралеўскую плошчу, адразу ўбачылі рэйхстаг. Аб гэтым марылі мільёны савецкіх воінаў і ля сцен Сталінграда, і пад Новарасійскам, у Карэліі і пад Старай Русай, пад той самай Русай, дзе пачынаўся бая- вы шлях 171-й стралковай дывізіі, перадавыя падраздзяленні якой толькі што прарваліся на Каралеўскую плошчу.

Камандаванне 525-га стралковага палка пачало фарміраваць штурмавую групу. Галоўнай задачай групы быў не толькі прарыў да рэйхстага. Неабходна было ўзняць на ім перамоганосны сцяг. Увесь дзень нашы войскі спрабавалі прабіцца да рэйхстага. Але вораг адкрыў такі шквал агню, што нават танкі не маглі далёка прасунуцца па плошчы. Тады камандзір штурмавой трупы, старшы лейтэнант Коршунаў сфарміраваў спецыяльную трупу, якая павінна была данесці і ўзняць сцяг над рэйхстагам. У яе ўвайшлі камсорг другой стралковай роты Мікалай Белянкоў, сяржант Павел Смірноў і радавы

Леанід Сомаў. Было вырашана, што калі загінуць Белянкоў і Смірноў, сцяг павінен данесці да рэйхстага Сомаў. Першыя няўдачы не пахіснулі баяво- га духу салдат. Штурм жа апошняга прыстанішча ворага - ганаровае задание, ім даручылі ўзняць баявы сцяг над рэйхстагам.

Наступіў вечар. Кожны ўспамінаў баявы шлях, успамінаў Мікалай сваю вёску Глушнева, што раскінулася на высокім правым беразе Сажа, кровапралітныя баі на роднай зямлі.

Успомніліся і ўпартыя баі ў Беларусь Прыбалтыцы, Полынчы, цяжкі шлях ад Одэра да Берліна. У Полынчы Мікалая цяжка параніла. Паўтара месяца давялося лячыцца ў шпіталі. Потым зноў баі. Вязло, двойчы ў баях пад Берлінам загінулі ўсе яго сябры па кулямётным разліку, а ён працягваў ваяваць.

... Камандаванне накіравала на дапамогу штурмавой трупе два танкі. Артылерысты занялі новую пазіцыю, каб біць па рэйхстагу прамой наводкай. Здавалася, што час цягнецца вельмі марудна. І вось 30 красавіка 1945 года, 18 гадзін. І плошча, і рэйхстаг, і прылеглыя вуліцы ўздрыгнулі ад магутнага залпа арудзій і мінамётаў. У гэтую сімфонію залпаў упісаліся чэргі кулямётаў і аўтаматаў. Рэйхстаг ахутаўся дымам.

Пехацінцы пад прыкрыццём танкаў пайшлі ў атаку. Сярод іх былі Мікалай Белянкоў і Павел Смірноў са сцягам у руках. Нечакана адзін танк прыпыніўся ад прамога пападання снарада. Мікалай мінуў яго і кінуўся наперад. Усё бліжэй і бліжэй рэйхстаг. Амаль побач яго каланада. Белянкоў збег па лесвіцы. Сцяг ужо ў руках Сомава. Ён ускочыў на плечы Белянкову і сцяг хутка ўзняўся на калоне.

Гітлераўцы не ўтрымалі перадавую трупу, але яны не маглі адсекчы Ураганным агнём астатнія падраздзяленні штурмуючых. З другога боку рэйхстага прасачыліся воіны 150-й стралковай Ідрыцкай дывізіі. Рэйхстаг гарэў. Але воіны прабіваліся наперад. Уначы 1 Мая над рэйхстагам узняўся сцяг Перамогі. Яго ўстанавілі былы беларускі партызан Міхаіл Ягораў і воін з Грузіі Мелітон Кантарыя. У самым памяшканні рэйхстага працягваўся бой. Хутка афіцэр Берэст з 150-й Ідрыцкай дывізіі прад'явіў ультыматум гітлераўцам. Фашысты нарэшце здаліся.

За подзвіг, здзейснены пры штурме рэйхстага, Мікалай Цімафеевіч Белянкоў быў узнагароджаны ордэнам Славы І ступені.

У публікацыях удзельнікаў штурму Берліна ўпамінаецца імя Мікалая Белянкова. Мы звярнулі ўвагу на характэрнае для нашай мясцовасці прозвішча. У вёсках Глушнева, Бель 1-я, Бель 2-я, Бель 3-я шмат Белянковых. Пачалі высвятляць месца нараджэння ўдзельніка штурму рэйхстага. З дапамогай аднавяскоўца Мікалая Цімафеевіча, калгаснага механізатара, і краязнаўцаў школы з вёскі Паляцічы, атрымалі адрас земляка. М.Ц. Белянкоў даслаў пісьмо з Бярдычава, дзе ён працягваў служыць у Савецкай арміі. Паведаміў, што ваяваў як усе. Потым ён прыязджаў у Маляцічы, сустракаўся са школьнікамі, следапытамі Крычава. Выступаў у школах, клубах. На адной з сустрэч яму было зададзена пытанне: «Чаму на калонах рэйхстага няма Вашага подпісу, хто з Вамі яго штурмаваў?».

Адказ быў простым і зразумелым кожнаму ўдзельніку сусутрэчы.

—Шаноўныя, мы проста не думалі

аб гэтым. Не важна, што нашы імёны не засталіся на калонах рэйхстага. Галоўнае мы зрабілі - выканалі свой доўг перад Радзімай як маглі, рэйхстаг узялі.

*М.Ф. Мельнікаў.*

## Не ўсе раны зажываюць

Леаніду Крываносаву не споўнілася і сямнаццаці гадоў, калі пачалася вайна. Гітлераўцы набліжаліся да Крычава. Адным з першых ён адгукнуўся на заклік райкомаў партыі і камсамола дапамагчы эвакуіраваць жывёлу ў тыл.

Нялёгкі тэта быў шлях. За суткі даводзілася пераадольваць па 45—50 кіламетраў лясістай, узгорыстай дарогі. Але галоўная бяда заключалася не толькі ў тым, што ў цяжкай дарозе пакідалі сілы. За статкамі кароў і людзьмі палявалі нямецкія самалёты. Кідалі бомбы, абстрэльвалі з кулямётаў. Некалькі чалавек атрымалі ра- ненні. Іх везлі на калёсах. Прыходзілася рухацца ноччу, а днём хавацца ад варожага вока ў лясах.

І ўсё ж статак дагналі да Арла, потым жывёлу эвакуіравалі ў калгас імя Молатава Саснова-Саланецкага раёна Куйбышаўскай вобласці. Пакуты скончыліся, можна было адпачываць, тым больш, што тут не раўлі над галавой гітлераўскія самалёты, не бухалі выбухі снарадаў. Аднак юнак не думаў пра адпачынак.

Леанід пайшоў у ваенкамат. Прыпісаў сабе два гады і трапіў у армію. Яго залічылі курсантам вайсковага пяхотнага вучылішча ў Куйбышаве. А па заканчэнні прызначылі камандзірам стралковага ўзвода 18-й Чырванасцяжнай гвардзейскай дывізіі 16-й арміі.

Малады, нявопытны, як кажуць, неабстраляны юнак узначаліў узвод. А ва ўзводзе салдаты старэйшыя ўзростам, якія панюхалі пораху і не раз глядзелі смерці ў твар. Спачатку не надта паважалі яны свайго камандзіра. Павага і любоў байцоў да свайго камандзіра прыйшлі паступова. Ён у баях праяўляў пэўныя камандзірскія здольнасці, не даваў бязглуздых загадав шкадаваў воінаў і сам кідаўся ўперад, не хаваючыся ў цяжкім баі ад куль. Кулі нібы паважалі такую адвагу.

Масква—Старая Руса—Арлоўскі накірунак—Курская дуга. Такім баявым шляхам прайшла дывізія. І ўсюды баі, цяжкія, кровапралітныя. Пасля кожнай сутычкі з ворагам узвод недалічваўся некалькіх байцоў. Капалі магілы з маўклівай злосцю, са спахмурнелымі тварамі. А потым зноў баі.

Пасля першага ранения Леанід адляжаўся ў шпіталі і зноў вярнуўся ў строй. Другое ранение прымусіла забыць аб арміі. Крываносаў страціў шмат крыві, яго падабралі санітары. Лічылі, што не выжыве, але з дапамогай урачоў Леанід перамог смерць. Каля года лячыўся ў Томску. Вярнуўся ў Крычаў у 1946 годзе, пра- цаваў выкладчыкам ваеннай справы ў сярэдняй школе № 1. Любілі і паважал! яго вучні, як і некалі салдаты на фронце. За дабрыню, дысцыплінаванасць, душэўную чысціню, спагадлівасць.

Даўно ўжо закончылася вайна. Цішыня гаспадарыла ўсюды. Але не для яго. Сляды вайны жылі ў яго целе,

болем напаміналі аб сабе атрыманыя раны. Памёр Леанід Сідаравіч Крываносаў. Не ўсе раны зажываюць.

На пахаванні сябры неслі ордэн Чырвонай Зоркі і чатыры медалі, сярод якіх быў медаль «За адвагу».

А споўнілася яму ў той час усяго 41 год.

## Наш апошні бой

### З успамінаў Я. Бяспалава, былога камандзіра гарматнага разліку

Да Эльбы заставалася кіламетраў шэсць. Стралковы батальён каштана Папова рухаўся па лясной дарозе калонай. За батальёнам следаваў артылерыйскі ўзвод палковай батарэі старшага лейтэнанта Камарова.

Лес маўчаў. Галоўныя і бакавыя дазоры падавалі сігналы, што праціўніка няма.

Канчаўся цёплы дзень 7 мая 1945 года. Лясное паветра пахла смалою. Аб вайне напаміналі рэдкія разрывы снарадаў дзесьці справа, за лесам. Наша дальнабойная артылерыя маўчала. Быў загад: за Эльбу не страляць, там саюзнікі - амерыканцы.

Старшы лейтэнант Камароў сказаў камандзіру разліку Іванову:

—Цішыня не да спадобы мне.

—Можа, фашысты да амерыканцаў драпанулі, — адказаў той.

—Не маглі паспець. На світанку бой трымалі.

—Тады дзесьці прытаіліся.

—Гэта найбольш верагодна.

Галава калоны батальёна сутыкнулася з варожай засадай нечакана. Толькі выйшлі на паляну, як з густога ельніку застракаталі кулямёты. Пра- шыты шасцю кулямі, упаў капітан Папоў. Усю вайну прайшоў чалавек. А тут, ля Эльбы, напаткала храбрага камандзіра смерць. ГІехацінцы рассыпался па ўскрайку паляны, завязалі бой.

Ездавыя галаўнога гарматнага разліку не паспелі павярнуць упражкі пад ахову тоўстых хваін, як коней зрэзала кулямётная чарга. Камандзір разліку Іваноў нажом абрэзаў пастромкі і разлік развярнуў гармату ў бок ворага. Кулямёт фашыстаў стаяў насупраць дарогі, паліваў яе выхад на паляну доўгімі чэргамі.

Фугасным снарадам наводчык з першага стрэлу прымусіў змоўкнуць варожы кулямёт. Разлік другой гарматы таксама адкрыў агонь па абароне праціўніка. Адна за другою змаўкалі варожыя агнявыя кропкі, слабеў агонь аўтаматчыкаў. Асколачныя снарады дзвюх гармат змяталі іх з абароны. Справа і злева забухалі гранаты, прагучала «ура». Батальён перайшоў у атаку.

Цяпер стралкі і аўтаматчыкі батальёна ішлі па лесе шырокім ланцугом. Перастрэлка ўспыхнула і тут жа затухла. Перад выхадам з лесу зноў завязаў- ся жорсткі бой. Фашысты ўпарта не пускалі нашых байцоў да перапраў. Камандзір палка прыслаў батальёну падмацаванне - палкавую роту аўтаматчыкаў і другі ўзвод батарэі. Перад заходам сонца супраціўленне ворага было зломлена. Аўтаматчыкі захапілі ў палон восем фашыстаў. 3 васьмі толькі адзін аказаўся немцам, астатнія былі рускія, з фарміравання «Паліцай- СС». На рукавах шынялёў - злавесная фашысцкая свастыка і чэрап з касця- мі. Калі падыйшоў камандзір палка падпалкоўнік Манузін, паліцаі сталі перад ім на калені і пачалі прасіць літасці.

—Позна, — сказаў кампалка. - Ды я вас у палон не браў. У салдат прасіце.

Здраднікаў расстралялі.

Ноччу выйшлі да Эльбы. На супрацьлеглым беразе амерыканскія дазоры пускалі ракеты. Пуставалі перакінутыя цераз раку пантонныя масты. Густа стаялі па-над берагам кінутыя ворагам аўтамабілі, цягачы, бронетранспарцёры, танкі, павозкі, гарматы. Яны напаміналі магільнікі грознай яшчэ ўчора фашысцкай тэхнікі.

Раніцай 8 мая ў напрамку Эльбы рухалася вялікая калона гітлераўцаў. Нашы прад'явілі ультыматум на здачу ў палон. Генерал адхіліў гірапанову і даў каманду да бою. Ён спадзяваўся прабіцца да пераправы і здацца амерыканцам. Але не паспелі фашысты прыняць баявы парадак, як шквальным агнявым ударам артылерыйскіх і мінамётных батарэй з калонай было пакончана. Генерал-фашыст застрэліўся. Хто застаўся ў жывых, палічыў за лепшае здацца ў палон нашым салдатам.

Тэта быў апошні бой артылерыстаў батарэі старшага лейтэнанта Камарова на цяжкіх дарогах Вялікай Айчыннай вайны.

# Яны прайшлі дарогамі вайны

**Горад КРЫЧАЎ**

**АБЛАКАЗАЎ Сцяпан Фёдаравіч,** н. у 1919, радавы. Ваяваў на Сталінградскім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АБУХОВІЧ Міхаіл Нічыпаравіч,** н. у 1919, радавы. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АВЕТЧАНКА Адам Аляксандравіч,** н. у 1924, сяржант. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

**АГАПАЎ Аляксандр Іванавіч,** н. у 1918, мал. сяржант. Ваяваў на Заходнім, 2-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «Заадвагу», «За перамогу над Германіяй».

**АГЕЕНКА Антон Паўлавіч,** н. у 1914, радавы. Ваяваў на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АЗАРАВА Юлія Адольфаўна,** н. у 1920, радавая. Ваявала на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджана медалём «За перамогу над Германіяй».

**АЗАРАЎ Іван Фёдаравіч,** н. у 1919, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 2-м Беларускім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За абарону Масквы», «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

**АЗАРАЎ Мікалай Фёдаравіч,** н. **у 1923,** яфрэйтар. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АЗАРАЎ Сцяпан Апанасавіч,** н. у 1918, радавы. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, Калінінскім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

**АКІМАЎ Мікалай Іванавіч,** н. у 1923, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АЛДОХІН Мікалай Раманавіч,** н. у 1925, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «Заўзяцце Кёнігсберга», «Заўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

**АЛІЕЎ Асад Гайдаравіч,** н. у 1923, сяржант. Ваяваў на Сцяпным, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

**АЛЯКСЕЕНКА Алена Пятроўна,** н. у 1917, медсястра. Узнагароджана медалём «За перамогу над Германіяй».

**АНГЕЛЬЦАЎ Васіль Гаўрылавіч,** н. у 1923, мал. сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АНДРУШЧАНКА Міхаіл Іванавіч,** н. у **1913,** радавы. Ваяваў на Заходнім фронце.

**АНДРЭЕЎ Васіль Андрэевіч,** н. у **1**926, радавы. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АНДРЭЕУ Іван Харытонавіч,** н. у 1914, сяржант. Ваяваў на Заходнім, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

**АНДРЭЕЎ Пётр Навумавіч,** н. у 1902, яфрэйтар. Ваяваў на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АНІКЕЕЎ Леанід Паўлавіч,** н. у 1925, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце.

**АНІКЕЕЎ Пётр Фаміч,** н. у 1922, сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «За ад вагу», «За перамогу над Германіяй».

**АНІСІМАЎ Рыгор Гаўрылавіч,** н. у **1917,** радавы. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За ад вагу», «За перамогу над Германіяй».

**АНІШЧАНКА Міхаіл Іванавіч,** н. у 1920, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

**АНОШКА Гвідон Людвігавіч,** н. у 1923, радавы. Ваяваў на Заходнім, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

**АНПІЛАЎ Аляксей Фёдаравіч,** н. у 1914, радавы. Ваяваў на 1-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АНТАНКАЎ Якаў Маркавіч,** н. у 1923, радавы. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АНТОНАЎ Васіль Мікалаевіч,** н. у 1925, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АНТОНЕНКА Рыгор Фаміч,** н. у 1922, мал. сяржант. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АНТУСЕЎ Іван Дзмітрыевіч,** н. у 1922, сяржант. Ваяваўна Сталінградскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

**АПАЛКА Барыс Іванавіч,** н. у 1922, яфрэйтар. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АРЦЁМАУ Васіль Іосіфавіч,** н. у 1923, мал. сяржант. Ваяваў на Калінінскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

**АСМАЛОЎСКІ Герасім Герасімавіч,** н. у 1903, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Бранскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

**АСМАЛОЎСКІ Зміцер Яўхімавіч,** н. у 1920, радавы. Ваяваў на Заходнім, Бранскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

**АСМАЛОУСКІ Іван Іванавіч,** н. у 1926, старшына. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

**АСМАЛОЎСКІ Міхаіл Андрэевіч,** н. у 1923, радавы. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АСТАНКЕВІЧ Рыгор Дзям'янавіч,** н. у 1921, сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

**АСТАПАВА Валянціна Сцяпанаўна,** н. у 1924, удзельніца партызанскага руху.

**АСТАПАЎ Фёдар Апанасавіч,** н. у 1914, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 2-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

**АСТАПЕНКА Міхаіл Данілавіч,** н. у 1918, радавы. Ваяваў на Бранскім, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АСТАПЕНКА Міхаіл Фёдаравіч,** н. у 1924, ст. сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За перамогу над Германіяй».

**АСТРАВ УХАЎ Аляксандр Філіпавіч,** н. у 1923, радавы. Ваяваў на 2-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АЎДЗЕЕНКА Аляксандр Якаўлевіч,** н. у 1926, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АЎРАМЕНКА Іван Андрэевіч,** н. у 1915, радавы. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**АЎЧЫННІКАЎ Сцяпан Сямёнавіч,** н. у 1919, радавы. Ваяваў на 1-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

**АФАНАСЕНК А Аляксандр Восіпавіч,** н.у 1924, радавы. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «Заўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

**АФАНАСЬЕЎ Міхаіл Аксёнавіч,** н. у 1925, мал. сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

**АХАРЦАЎ Віктар Міхайлавіч,** н. у 1911, старшына. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

**БАБАРЫКІН Іван Сцяпанавіч,** н. у 1919, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім франтах.

**БАДЗЕЕЎ** Мікалай Рыгоравіч, н. у 1917, старшына. Ваяваў на Цэнтральным, 1-м Украінскім

франтах. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны III ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

**БАДРОЎ Мікалай Іванавіч,** н. у 1914, радавы. Ваяваў на 1-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

**БАЖКОЎ Міхаіл Ермалаевіч,** н. у 1915, радавы. Ваяваў на 2-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**БАЗЫЛЕВІЧ Ганна Флягонтаўна,** н. у 1922, радавая. Ваявала на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджана медалём «За перамогу над Германіяй».

**БАЗЫЛЕЎ Павел Адамавіч,** н. у 1922, радавы. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце.

**БАКУЛЕНКА Мікалай Мікалаевіч,** н. у 1904, радавы. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**БАКУТАЎ Аляксей Мікалаевіч,** н. у 1922, мал. сяржант. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі»,«За перамогу над Германіяй».

**БАЛДЭСАЎ Віктар Фядосавіч,** н. у 1924, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**БАЛДУЕЎ Іван Іларыёнавіч,** н. у 1923, сяржант. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, 2-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За перамогу над Германіяй».

**БАЛКУЗАЎ Георгій Мікалаевіч,** н. у 1921, радавы. Ваяваў на Сцяпным, 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

**БАЛОННІКАЎ Мікалай Мікалаевіч,** н. у 1923, радавы. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**БАНДАРЭНКА Міхаіл Пятровіч,** н. у 1918, сяржант. Ваяваў на Паўднёва-Заходнім, Бранскім, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

**БАНДАРЭНКА Пётр Міхайлавіч,** н. у 1913, радавы. Ваяваў на 2-м Украінскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**БАНДАРЭНКА Таццяна Іванаўна,** н. у 1922, медсястра. Узнагароджана медалём «За перамогу над Германіяй».

**БАРАБАШ Іван Міхайлавіч,** н. у 1914, радавы. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

**БАРАБОШКІН Павел Ільіч,** н. у 1928, сяржант. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

**БАРАВІКОЎ Аляксей Іванавіч,** н. у **1917,** ст. сяржант. Ваяваўна Паўднёва-Заходнім, Бранскім, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

**БАРАВІКОЎ Ілля Макаравіч,** н. у 1920, радавы. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**БАРАВІКОЎ Канстанцін Цімафеевіч,** н. у 1913, радавы. Ваяваў на Прыбалтыйскім фронце. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

**БАРАНЦАЎ Аляксандр Ілліч,** н. у **1910,** старшына. Ваяваў на Заходнім, Сталінградскім, 2-м Украінскім франтах. Узнагароджаны медалямі «За абарону Сталінграда», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

**БАРАШКАЎ Аляксандр Клімавіч, н.** у **1914,** радавы. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За абарону Масквы», «За перамогу над Германіяй».

**БАРАШКАЎ Уладзімір Клімавіч, н.** у 1926, ст. сяржант. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны медалямі «За абарону Масквы», «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

**БАРГУЦІН Іван Андрэевіч,** н. у 1913, яфрэйтар. Ваяваў на Паўночна-Каўказскім, 2-м Украінскім франтах. Узнагароджаны мёдалямі «За абарону Каўказа», «За перамогу над Германіяй».

